Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
25 КРАСАВІКА 2020 г.
СУБОТА
№ 81 (29195)


АСАБЛІВАСЦІ ЖЫЦЦЯ Ў ПУШЧЫ 10


ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЗАЛЯЦЕЎ КАЖАН? 12

З першых вуснаў

## «ЗЯМЛЯ, РУКІ ЛЮДСКІЯ І ЛЕС — ГЭТА РЭСУРС, ЯКІ МЫ ПАВІННЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ РУПЛІВА»

### Прэзідэнту ўнеслі на разгляд праект указа «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны»

**«Лес — наша багацце» — з такога тэзісу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пачаў размову з віцэ-прэм'ерамі Уладзімірам Дворнікам, Юрыем Назаравым, міністрам лясной гаспадаркі Віталем Дрожжам і старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанідам Анфімавым. Нагода для сустрэчы — унясенне на разгляд праекта указа «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны».**

Прэзідэнт заўважыў, што да такога багацця, як лес, адносяцца часам нядбайна: «Я ўпэўнены, калі б мы да прыроды адносіліся адказна і з павагай, то мы б жылі не толькі значна лепш, але і вірусы нас бы не ўзялі. Таму што гэта не толькі багацце, гэта здароўе нашых людзей».

«Лес — гэта крыніца, рэсурс, сыравіна для многага, — звярнуў увагу ён. — Мы шмат зрабілі апошнім часам для таго, каб выкарыстоўваць гэты наш аднаўляльны рэсурс. У нас няма столькі нафты, як, дапусцім, у Расіі, у нас няма прыроднага газу, ***таму ў нас зямля, рукі людскія і лес — гэта рэсурс, які мы павінны выкарыстоўваць руплівa***. І калі гэта наша багацце, трэба прырастаць лесам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Але перш за ўсё яго цікавіла цэнаўтварэнне ў гэтай сферы.

«Вы ўносіце праект указа, які ў значнай ступені мяняе парадак рэалізацыі лясных рэсурсаў у Рэспубліцы Беларусь. Якія вы ўносіце прапановы? Я хацеў бы, каб іх выклалі і абгрунтавалі, перад тым як я падпішу гэты ўказ. І адкажыце мне на пытанне, навошта патрэбны гэты ўказ і чаму мы не можам працаваць у той сістэме каардынат, якія сёння ёсць, чаму яе трэба змяняць. Калі мы прыйдзем да агульнага меркавання ***і гэта будзе выгадна і лепш для нашай эканомікі і нашых людзей — мы гэтую сістэму ці памяняем, ці падрамантуем, удасканалім»***, — звярнуўся да прысутных беларускі лідар.

Мэта ўсіх новаўвядзенняў, паводле заўвагі Прэзідэнта, адна — мы не можам па-варварску адносіцца да лясных рэсурсаў, і ўсё зробленае павінна быць у плюс для бюджэту краіны.

Юрый Назараў заўважыў, што працаваць у існуючай сістэме нішто не перашкаджае, а новаўвядзенні прапануюць, каб падладзіць яе пад рэаліі жыцця. Правілы рэалізацыі драўніны на ўнутраным рынку дзейнічаюць з 2007 года і за гэты час, зразумела, адбыліся пэўныя змены.

Прэзідэнт дадаў: «На знешні рынак мы ***павінны прадаваць прадукцыю лясной гаспадаркі з высокай дабаўленай вартасцю***. Каб не атрымалася так, што вы напалову распілуеце ці дошку зробіце і прадасце ў Германію, Славакію ці яшчэ куды-небудзь, а яны з гэтай дошкі зробяць мэблю і прывязуць нам, прададуць у нашай краіне. ***Мы самі павінны рабіць, наколькі гэта магчыма***. Я разумею, што мы не ўсё можам перапрацаваць і прадаць гатовае з высокай дабаўленай вартасцю. Але апошні досвед паказвае на тое, што многае можам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

У размове з журналістамі віцэ-прэм'ер Юрый Назараў расказаў, што прынята рашэнне дапрацаваць праект указа і далажыць Прэзідэнту.

«Увогуле праект указа прадугледжваў некалькі рэчаў. Асноўны блок — упарадкаваць правілы рэалізацыі на ўнутраным рынку, яны дзейнічалі з 2007 года. Мы прапанавалі механізм упарадкаваць, але былі не зусім пераканаўчыя», — паведаміў ён. Удасканалення патрабуюць правілы рэалізацыі прадукцыі. «Як прадаваць, якія аб'ёмы прадаваць, каму прадаваць, праз біржу, даць магчымасць аблвыканкамам прымаць рашэнні на месцах, каб частку рэсурсу размяркоўваць, мінаючы біржавыя таргі для развіцця малога і сярэдняга бізнесу, прадпрымальніцтва і гэтак далей. Прапанавалася карэкціроўка дзеючых правіл з улікам сённяшніх рэалій», — дадаў віцэ-прэм'ер.

Дакумент ствараецца ў інтарэсах Беллеспаперпрама і Міністэрства лясной гаспадаркі, таму на працягу наступнага тыдня, па словах Юрыя Назарава, магчыма, дакумент будзе дапрацаваны і ўнесены Прэзідэнту.

## «ГОРАД-ВОІН» ІЗНОЎ «У СТРАІ»





На жылых будынках на сталічным праспекце Незалежнасці (мікраараён Усход-1) ідзе рэстаўрацыя мазаічных пано «Горад-воін» і «Горад-будаўнік» народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі. Зробленыя ў 1978-1979 гадах, самыя вялікія ў Мінску пано — гістарычна-культурная каштоўнасць Беларусі. Займаюцца аднаўленнем пашкоджаных участкаў мазаікі спецыялісты арганізацыі «Белрэстаўрацыя». На гэтых фота — рэстаўрацыя мазаічнага пано пад назвай «Горад-воін».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Мы паглядзім, як будзе развівацца сітуацыя, і прымем узважанае рашэнне. Але адразу можна сказаць, што выпускнікам не трэба турбавацца: ніякіх змен па форме правядзення ўступнай кампаніі не будзе. А як яе зрабіць бяспечнай, стварыць аптымальныя ўмовы — гэтае пытанне цяпер прапрацоўваецца. На гэтую тэму ў інтэрнэце і СМІ з'яўляецца шмат укідаў. Пішуць: давайце памяняем форму ўступных іспытаў, давайце наогул іх адменім і па конкурсе атэстатаў правядзём і гэтак далей. Напэўна, гэта будзе няправільна і створыць няроўныя ўмовы».*

Мы — разам

## ПЛАЗМА СУПРАЦЬ «КАРОНЫ»

### Тыя, хто вылечыўся ад інфекцыі, становяцца донарамі для цяжкахворых

**У сацсетках можна цяпер сустрэць пасты пра тое, што для хворага на каранавірусную інфекцыю тэрмінова патрабуецца плазма ад донара, які раней перахварэў. Але шукаць яго самастойна такім чынам не варта. РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій з'яўляецца пакуль адзіным месцам у Мінску, дзе могуць здаць імунную плазму крыві тыя, хто гатовы дапамагчы паправіцца іншым. Тут маюць кантакты ўсіх, хто папраўіўся, з імі звязваюцца і прапануюць стаць донарамі. Большасць — пагаджаецца. Іншая рэч, што здаваць плазму можна толькі праз 15 дзён пасля поўнага выздараўлення. І пакуль у краіне такіх людзей не вельмі шмат, гэта жыхары сталіцы і Віцебска, дзе былі выяўлены самыя першыя ачагі інфекцыі. Але з кожным днём патэнцыйных донараў будзе станавіцца больш.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Для іх усё даволі проста: узрост павінен быць ад 18 да 60 гадоў, вага — ад 50 кілаграмаў, чалавек павінен быць здаровы. Працэдура займае ўсяго паўгадзіны, і плазма, якую ўзялі раніцай, ужо ўвечары адпраўляецца ў бальніцы. Медустановы, дарэчы, самі звяртаюцца ў РНПЦ, калі ў іх маецца пацыент, якому падыходзіць такі метад лячэння. Такім чынам, плазма больш як ад двух дзясяткаў донараў ужо дапамагае справіцца з хваробай тым, хто знаходзіцца ў цяжкім стане. Як працуе сёння служба крыві, у тым ліку і па назапашванні імуннай плазмы, праінспектаваў учора **віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА**, наведаўшы РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій.

СТАР. 2

Добрая справа

## АБЕДЫ АД ЧЫСТАГА СЭРЦА

### Маленькая магілёўская кавярня натхняе сваім прыкладам жыхароў вобласці на барацьбу з каранавірусам

**Сталы шчыльна застаўлены кантэйнерамі для ежы, спрытныя рукі запаўняюць іх салатамі, гарачымі стравамі, супам... Роўна ў 12.40 усё гэта будзе загружана ў машыну, і чарговы гуманітарны рэйс адправіцца ў напрамку інфекцыйнай бальніцы і лабараторыі Магілёўскага абласнога Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Гэта карцінка з сённяшняга жыцця магілёўскай міні-кавярні «Мяса&Лаваш», якая вось ужо другі месяц забяспечвае медыкаў гарачымі абедамі. Установа падтрымала сваіх мінскіх калег, дзе ў гэтай справе задзейнічана больш за 10 кавярняў і рэстаранаў. У Магілёве гэта пакуль адзіны падобны дабрачынны прыклад.**



Віктар і Уладзіслаў гатуюць абед для медперсаналу.

На пачатку эпідэміі ўстановы грамадскага харчавання сталі скарачаць час работы, некаторыя наогул перайшлі выключна на дастаўку: вядома, за грошы. Спадзявацца на падтрымку дзяржавы не выпадае, бо ўсе разумеюць, што абстаноўка вельмі складаная і не зусім прадказальная. Энтузіясты магілёўскай міні-кавярні прыйшлі да высновы, што трэба дапамагаць тым, каму яшчэ складаней у гэтай сітуацыі. Урачы не могуць закрыцца ад людзей, каб перачакаць, — яны павінны змагацца за жыццё на перадавой. Але трэба, каб людзі ў белых халатах не лічылі сябе заложнікамі сітуацыі, каб ведалі, што ў іх ёсць надзейны тыл.

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЕС ухваліў праграмы посткрызіснай падтрымкі эканомікі на 540 мільярдаў еўра



Кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў краін Еўрасаюза ўхвалілі дарожную карту эканамічнага аднаўлення ЕС пасля крызісу COVID-19, паведаміў кіраўнік Еўрапейскага савета Шарль Мішэль. «Яна вызначае чатыры прыярытэтныя сектары дзеянняў. Гэта адзіны рынак, які цалкам функцыянуе; беспрэцэдэнтныя намаганні ў галіне інвестыцый; глабальныя дзеянні (супраць каранавіруса); сістэма кіравання, якая цалкам функцыянуе», — сказаў Мішэль на прэс-канферэнцыі ўвечары ў Бруселі пасля завяршэння віртуальнага саміту ЕС. Ён таксама паведаміў аб зацвярджэнні трох страхавачных праграм, якія павінны падтрымаць дзяржавы, прадпрыемствы і работнікаў, на агульную суму 540 мільярдаў еўра. «Мы прасілі, каб гэты пакет мог працаваць з 1 чэрвеня 2020 года», — падкрэсліў кіраўнік Еўрасавета.

### У Інданезіі забаранілі праводзіць нарады на платформе Zoom

Міністэрства абароны Інданезіі забараніла выкарыстоўваць у службовых мэтах платформу анлайн-канферэнцый Zoom у сувязі з пагрозамі нацыянальнай бяспецы. Пра гэта паведаміла газета The Jakarta Post са спасылкай на загад генеральнага сакратара ведамства віцэ-адмірала Агуса Сетыджы. Па словах афіцэра, «ёсць інфармацыя, што падчас нарад з дапамогай Zoom можа адбывацца дубляванне трафіку на серверы ў іншыя дзяржавы, што дае магчымасць трэцяму боку адсочваць змест перагавораў». «Профільным структурам пастаўлена задача знайсці альтэрнатыўныя сэрвісы для правядзення анлайн-канферэнцый», — падкрэсліў Агус Сетыджы. Газета The Washington Post раней паведаміла, што некалькі тысяч запісаў відэазванкоў, ажыццёўленых праз сэрвіс, апынуліся ў адкрытым доступе ў інтэрнэце.




### The Rolling Stones упершыню за восем гадоў выпусцілі новы сінгл

Легендарны брытанскі рок-гурт запісаў кампазіцыю Living In A Ghost Town («Жыццё ў горадзе-прывідзе»). Песня адсылае да пандэміі каранавіруса, а запісаная была ва ўмовах каранціну. Сэр Мік Джагер спявае радкі, якія можна перакласці як «жыццё было прыгожае, але цяпер мы ўсе ў лакдаўне. / Я быццам прывід, які жыве ў горадзе-прывідзе». У заяве групы адзначаецца, што песню пачалі запісваць яшчэ год таму, але скончылі працаваць над ёй ужо ва ўмовах ізаляцыі. У кліпе на кампазіцыю можна ўбачыць апусцелыя Лондан і іншыя гарады. Мік Джагер у інтэрв'ю Apple Music сказаў, што спадзяецца запісаць яшчэ некалькі песень у ізаляцыі, і прызнаў, што гурт пакуль не разумее, калі зможа працягнуць сусветнае турнэ.




ISSN 1990 - 763X
20081>
9 771990 763008

### КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб навучальным дні ў школах 1 мая.**
- У Беларусі адмянілі месячныя ліміты на пасылкі з-за мяжы і нормы бяспошліннага ўвозу тавараў у багажы, які суправаджаецца, у памеры 300 еўра і 20 кілаграмаў пры ўездзе фізічнай асобы ў Беларусь наземным транспартам часцей за адзін раз на тры месяцы.
- **У красавіку на большай частцы тэрыторыі Беларусі выпала не больш за 10—30 % ад кліматычнай нормы ападкаў.**
- Польшча перадала Беларусі добрасуседскую дапамогу для барацьбы з каранавірусам.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў сакавіку склаў Br1213,6.**
- Кожны пяты абследаваны жыхар Нью-Ёрка мае антыцелы да каранавіруса.
- **Інжынерная разведвальная машына «Жук» папоўніла экспазіцыю мемарыяла на Буйніцкім полі.**

Разумныя грошы

## НЕ БРАЦЬ НЕПАТРЭБНЫЯ КРЭДЫТЫ І ПРАДУКТЫ СКРЫНЯМІ

### Што яшчэ не раяць рабіць эксперты падчас фінансавых (і не толькі) крызісаў?

**Вось ужо сапраўды, калі чалавек адчувае фінансавыя праблемы па асабістых прычынах, дапамагчы яму складана. Аднак цяпер самы час пагаварыць не пра шкодныя фінансавыя звычкі асобных людзей, а пра аб'ектыўны знешні крызіс, калі ліхаманіць эканоміку цэлых дзяржаў і праблемы ўзнікаюць у паспяховых работнікаў. Меры фінансавай гігіены пры знешніх узрушэннях ёсць, і яны правераны вопытам многіх мінулых крызісаў. Што ж рабіць у гэты час рызыкоўна, бессэнсоўна ці нават шкодна?**

### На праяданне? Не трэба

Падчас гэтай пандэміі спецыялісты прадказваюць значнае падзенне рэальных даходаў людзей. Таму крэдыты лепш не браць. І рух валютных курсаў тут не асабліва важны. Якая б ні была інфляцыя, банкі не будуць працаваць сабе ва ўрон — яны яшчэ вышэй падымуць працэнтныя стаўкі альбо скароцяць тэрміны вяртання. Выключэнне — некаторыя крэдыты з дзяржпадтрымкай, але праесці іх наўрад ці ўдасца — расходаванне гэтых сродкаў кантралюецца, а нямэтавае іх выкарыстанне караецца.

Лепш зыходзіць з таго, што за першым крызісным месяцам могуць прыйсці іншыя, не менш крызісныя, што даходы сапраўды ўпадуць, і каб аддаць сённяшні крэдыт, які быў зусім неабавязковы, давядзецца жыць надгаладзь або прадаваць ліквідныя рэчы.

Асабліва небяспечнымі становяцца зручныя ў іншы час авердрафтныя карткі, таму што стаўкі па іх звычайна вышэйшыя, чым па класічных крэдытах, а тэрміны вяртання значна карацейшыя.

### У мясцовай валюце лепш збіраць невялікія сумы

Парада дзейсная для большасці былых савецкіх дзяржаў. Ёсць краіны, дзе валютны курс устойлівы, як народныя звычаі, і не мяняецца нават пры галадзе. Але большасць краін вырашае эканамічныя праблемы друкаваннем новых грошай, што прыводзіць да росту цэн і значнай інфляцыі. Збіраць наяўныя банкноты і манеты — значыць проста назіраць, як яны патроху знікаюць з «закрытай скарбонкі». Прыблізна тое ж здараецца з грашыма на большасці дэбетных картак, дзе працэнты па іх звычайна не пакрываюць нават інфляцыю дакрызіснага перыяду.

СТАР. 3

# Плазма супраць «кароны»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Санэпідслужба пачала перадаваць звесткі пра тых, хто паправіўся, мы тэлефануем людзям і прапануем прыйсці і здаць кроў, — уводзіць у курс справы **дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.** — Рыхтаваліся загадзя: на працягу апошніх двух месяцаў прапрацоўвалі пытанне выкарыстання імуннай плазмы. Нягледзячы на тое, што гэта новая інфекцыя, падобны вопыт мы мелі з 2009 года — з часу эпідэміі грыпу H1N1.

У цэнтры рыхтавалі дакументы, арганізоўвалі ўсё, каб аператыўна прыступіць да нарыхтоўкі плазмы. Стараліся не страціць ні дня:

— Мы ўзялі дазвол Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, звязаліся з кітайскімі і нямецкімі калегамі. Чалавек перахварэў, паправіўся, і наша задача — не нашкодзіць яго здароўю. Таму мы максімальна прадумвалі, як абследаваць донара перад тым, як дапускаць да данацыі, — падкрэслівае Фёдар Карпенка.






Таму ў цэнтры выконваецца максімальны аб'ём абследаванняў, аналіз крыві, у тым ліку біяхімічны. Вельмі важны момант — наяўнасць антыцел. Калі іх не акажацца, кроў усё роўна возьмуць. Яе кампаненты спатрэбяцца і для іншых мэт.

**«Ужо паправіліся 1120 пацыентаў. Многія з іх з'яўляюцца патэнцыйнымі донарамі плазмы і могуць аказаць садзейнічанне ў выздараўленні цяжкіх пацыентаў».**

— Для выяўлення антыцел мы арганізавалі тэсты. На наступным тыдні дадаткова атрымаем карэйскую партыю тэст-сістэм на імунаглабуліны. Магчыма, будзем рабіць аналіз і нашым пастаянным донарам, якія рэгулярна прыходзяць на данацыі. Паколькі некаторыя людзі хварэюць у лёгкіх і субклінічных формах, магчыма, такім чынам мы знойдзем тых, хто перахварэў і не ведае пра гэта, — дзеліцца планамі кіраўнік РНПЦ.

З 21 красавіка нарыхтоўка імуннай плазмы арганізавана ў Віцебску. У хуткім часе яна пашырыцца на ўсе абласныя цэнтры. Адзін донар здае 400—500 мілілітраў крыві. Для аднаго хворага пацыента патрэбны 2-3 донары, бо, як правіла, плазму пералiваюць некалькі разоў. Яна зашыфроўваецца кодамі на этапе здачы, і, як правіла, донар і рэцыпіент не ведаюць адно аднаго.

Мінчанін Ігар заразіўся COVID-19, калі быў на гарналыжным курорце ў Аўстрыі. Пасля вяртання з-за мяжы яго абследавалі. Тэст аказаўся станоўчы. Лячэнне ён праходзіў у сталічнай інфекцыйнай бальніцы. Зусім нядаўна прачытаў, што можа стаць донарам, імкнуўся датэлефанавацца ў пункты, дзе прымаюць кроў, а праз пару дзён яму пазванілі з РНПЦ трансфузіялогіі. У пятніцу з раніцы прыехаў для здачы плазмы.

Донарскую кроў і плазму прымаюць як на бязвыплатнай аснове, так і за грошы. Дарэчы, за данацыю плазмы выплачваюць каля 130 рублёў. Кожная чацвёртая данацыя ў нас — бязвыплатная.

— Бязвыплатная — не значыць бясплатная. Мы кампенсуем харчаванне, у донара захоўваецца сярэдні заробак за дзень. Гэта не наша прыдумка, а рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, — тлумачыць Фёдар Карпенка. — Штодзённа ў цэнтр прыходзіць каля 300 донараў, па ўсёй краіне 1,5 тысячы чалавек удзельнічаюць у данацыях. За год выконваецца каля 350 тысяч данацый розных кампанентаў крыві. Кроў і яе кампаненты вельмі запатрабаваны — каля 50 медыцынскіх аўтамабіляў прыязджаюць штодзённа па донарскую кроў.

Віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка падкрэсліў, што назапашванне імуннай плазмы цяпер вельмі важны аспект. Сітуацыя з распаўсюджаннем COVID-19 знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы і ўрада. Актыўна ўцягнуты ў гэты працэс і кіраўнікі мясцовых органаў кіравання.

Ігар Петрышэнка падзяліўся і добрай навіной:

— Шэсць з дзевяці пацыентаў, хворых на COVID-19, а гэта 60 %, пасля пералівання плазмы пайшлі на папраўку. Гэта хоць і невялікая, але станоўчая практыка.

Як лічыць віцэ-прэм'ер, у Беларусі кіраваная сітуацыя з каранавіруснай інфекцыяй.

— Ужо паправіліся 1120 пацыентаў. Многія з іх з'яўляюцца патэнцыйнымі донарамі плазмы і могуць аказаць садзейнічанне ў выздараўленні цяжкіх пацыентаў, — адзначыў ён.

Ігар Петрышэнка дадаў, што ўсе пацыенты з COVID-19 забяспечаны меддапамогай. Урачы штодзённа карэкціруюць метады лячэння. Усяго ў барацьбе з успышкай інфекцыі, паводле яго слоў, задзейнічана каля 15—18 % медыкаў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**


Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк
«БСБ Банк»
www.bsb.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2020 г.

Закрытое акционерное общество «Белорусско-швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.04.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 104 | 28 218 | 23 460 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 105 | 19 927 | 19 901 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 106 | 21 588 | 57 275 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 107 | 110 556 | 102 697 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 108 | 110 801 | 68 433 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 109 | 24 742 | 22 190 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 110 | - | 1 234 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 111 | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 112 | 29 155 | 29 134 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 113 | 1 389 | 1 392 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 114 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 115 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 116 | 5 307 | 6 392 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 103 | 351 718 | 332 143 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 118 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 119 | 1 | 12 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 120 | 287 958 | 271 810 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 121 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 122 | 803 | 10 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 123 | 1 | 1 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 124 | 5 831 | 5 118 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 117 | 294 594 | 276 951 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 144 | 22 900 | 19 678 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 145 | 6 969 | 6 969 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 146, 147 | 19 215 | 19 443 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 148 | 8 040 | 9 102 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 143 | 57 124 | 55 192 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 351 718 | 332 143 |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 01.04.2020 г.

Закрытое акционерное общество «Белорусско-швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.04.2020 | 01.04.2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 127 | 2 831 | 2 372 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 127 | 362 | 369 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 127 | 2 469 | 2 003 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 128 | 6 141 | 5 305 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 128 | 2 843 | 1 655 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 128 | 3 298 | 3 650 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 129 | 10 | 4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 130 | (116) | (91) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 131 | 7 636 | 3 065 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 132 | (2002) | 169 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 133 | 1 230 | 227 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 134 | 533 | 112 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 136 | 6 674 | 5 594 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 135 | 194 | 162 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 3 730 | 2 929 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 137 | 862 | 519 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 125 | 2 868 | 2 410 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 154 | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | 153 | - | - |

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 10 апреля 2020 г.

УНП 807000069



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703**

**Продавец: ОАО «Строймаш», г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26**

**Предмет аукциона:**
**Лот № 1 – здание административного корпуса (здание административно-хозяйственное) общей площадью 1734,0 кв. м, инвентарный номер 500/С-20188, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 26.**

**Начальная цена (с НДС): 924 000,00 белорусских рублей**
**Шаг аукциона: 46 200,00 белорусских рублей**

Ограничения/обременения: ипотека, частичная аренда. Более подробная информация размещена на сайте **cpo.by.**
**Сведения о земельном участке:** земельный участок пл. 8,2013 га предоставлен продавцу на праве аренды по 31.05.2029 для эксплуатации здания заводоуправления и производственные цеха. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона, и произвести государственную регистрацию договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных продавцом. Расходы по оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем.

**Предмет аукциона: оборудование, бывшее в употреблении**
**Местонахождение: г. Минск, ул. Рыбалко, 26**

| Лот № | Наименование | Начальная цена (с НДС), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб |
|---|---|---|---|
| 2 | Пресс однокривошипный КГ2132, инв. № 1891 | 12 528,00 | 626,40 |
| 3 | Станок правильный МП-1У2, инв. № 1806 | 1 188,00 | 59,40 |
| 4 | Станок зубодолбежный 5М14, инв. № 2193 | 3 402,00 | 170,10 |
| 5 | Станок поперечно-строгальный 7М36, инв. № 2360 | 2 754,00 | 137,70 |
| 6 | Станок внутри-шлифовальный 3А250, инв. № 1858 | 2 052,00 | 102,60 |
| 7 | Станок вертикально-фрезерный 6С12П, инв. № 1923 | 853,20 | 42,66 |
| 8 | Станок горизонтально-расточной, инв. № 2030 | 4 914,00 | 245,70 |
| 9 | Станок отрезной круглопильный (автомат отрезной) 8Г662, инв. № 1618 | 2 538,00 | 126,90 |
| 10 | Станок отрезной круглопильный (автомат отрезной) 8Г662, инв. № 1621 | 2 538,00 | 126,90 |
| 11 | Моечная машина УМ01, инв. № 4088 | 1 312,20 | 65,61 |
| 12 | Пресс гидравлический НС-4, инв. № 2423 | 642,60 | 32,13 |
| 13 | Станок токарно-винторезный 1К625, инв. № 2380 | 1 765,80 | 88,29 |
| 14 | Пресс-ножницы комбинированные КПН-14, инв. № 1568 | 291,60 | 14,58 |
| 15 | Станок для правки и резки проволоки И-6022, инв. № 1450 | 3 456,00 | 172,80 |
| 16 | Полуавтомат абразивно-отрезной 8Г240, инв. № 1814 | 1 263,60 | 63,18 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Контактное лицо по осмотру, тел.: +37544 505-16-54, +37529 129-31-73 (Николай Маркович)

Лица, желающие принять участие в торгах, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Срок подписания договора купли-продажи** — **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

**По лоту № 1:** победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи в следующем порядке: не менее 50 % от стоимости лота (предмета торгов) с учетом внесенного ранее задатка – в срок не позднее 20 (двадцати) календарных дней с момента проведения аукциона, оставшуюся часть стоимости – в срок не позднее 30 (тридцати) календарных дней после государственной регистрации договора купли-продажи.

**По лотам № 2–16:** победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 (одного) процента (для объектов недвижимости) / 7 (семи) процентов (для оборудования и транспорта) от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 18.03.2020, в ЕГРСоБ 17.03.2020

**Дата, время, место проведения аукциона: 12.05.2020 в 11.00,** г. Минск, ул. Рыбалко, 26 (актовый зал в здании столовой), ОАО «Строймаш»

**Дата, время, место начала и окончания приема заявлений на участие в торгах: с 24.04.2020 в 15.00 по 08.05.2020 до 16.00**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны: +375 (17) 280 36 37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**



**ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»**

(220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А, комн. 327, тел. 8 (017) 398-20-40, www.integral.by)

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОДАЖЕ Б/У ОБОРУДОВАНИЯ:**

| Наименование | Стоимость с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|
| 1. Пресс-ножницы комбинированные НВ5222Б01, б/у, 1990 г. вып., инв. № 02255 | 2 496,00 |
| 2. Станок токарно-винторезный ИЖ-1И611П, б/у, 1976 г. вып., инв. № 56367 | 2 616,00 |
| 3. Станок вертикальный 6Т-13-1, б/у, 1988 г. вып., инв. № 93303 | 6 936,00 |
| 4. Универсальный фрезерный станок 6Т-80, б/у, 1989 г. вып., инв. № 96428 | 2 196,00 |
| 5. Токарно-револьверный станок УТ16ПМ, б/у, 1987 г. вып., инв. № 88925 | 4 068,00 |
| 6. Пресс И1020, б/у 1990 г. вып., инв. № 01449 | 3 120,00 |
| 7. Вертикально-фрезерный станок ВМ-127, б/у, 1982 г. вып., инв. № 67237 | 9 516,00 |
| 8. Вертикально-сверлильный станок 2Н125Л, б/у, 1983 г. вып., инв. № 68801 | 1 236,00 |

Указанная стоимость действует до 25.05.2020 г., условия оплаты – предоплата 100 % стоимости оборудования.

**Полный перечень оборудования, подлежащего отчуждению путем прямой продажи, размещен на сайте www.integral.by (раздел «О КОМПАНИИ/Реализация б/у оборудования»).**

Контактные лица: Сак Ольга Валерьяновна, тел.: 8 (029) 751-10-00, 8 (017) 398-65-47, e-mail: osak@integral.by.

УНП 100386629


Беражыце сябе!

# Мінімізаваць паездкі, пры першых сімптомах звяртацца ў паліклініку — на выхадных яны працуюць

## Медыкі зноў папярэдзілі беларусаў аб правілах бяспекі ў сувязі з каранавірусам

**Па распаўсюджанасці тэсціравання на мільён насельніцтва Беларусь апярэджвае Польшчу, Паўднёвую Карэю, Нідэрланды, Украіну і знаходзіцца на ўзроўні развітых еўрапейскіх краін і ЗША, пры гэтым займае другое-трэцяе месца ў СНД. З пачатку ўспышкі COVID-19 у Беларусі праведзена больш за 130 тысяч тэстаў, у тым ліку 8281 за апошнія суткі. На ўчарашні дзень зарэгістравана 8773 чалавекі са станоўчым вынікам тэста на каранавірусную інфекцыю (з пачатку яе распаўсюджвання ў краіне). Паправіліся 1120 пацыентаў, 63 чалавекі памерлі. Рэсурсаў для барацьбы з інфекцыяй у краіне дастаткова і выкарыстоўваецца пакуль толькі палова адведзенага ложкавага фонду. Пра гэта падчас брыфінгу расказала намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН.**

### Па колькасці тэстаў — на ўзроўні ЗША і развітых еўрапейскіх краін

Па-ранейшаму больш за ўсё хворых у Мінску — 4090. У Віцебскай вобласці — 1935, Мінскай — 1206. У Гомельскай вобласці ўстаноўлена 460 выпадкаў, Магілёўскай — 396, Гродзенскай — 347, Брэсцкай — 339.

Выяўленню выпадкаў інфекцыі ў нас удзяляецца вялікая ўвага. Праблем з тэст-сістэмамі ў краіне няма.

— Пры колькасці насельніцтва ў Польшчы амаль 38 мільёнаў там выканана 250 тысяч тэстаў, што складае 6,6 тысячы на мільён насельніцтва. У Беларусі пры колькасці насельніцтва каля 9,5 мільёна праведзена больш за 130 тысяч тэстаў, альбо 13,7 тысячы на мільён насельніцтва, — прывяла прыклад намеснік міністра.

Алена Богдан падкрэсліла, што медыкі асэнсавана «ідуць на гіпердыягностыку, каб не ўпусціць ніводнага выпадку». Па-ранейшаму па кожным выяўленым выпадку праводзіцца эпідрасследаванне. Пад назіраннем з пачатку ўспышкі знаходзілася каля 30,5 тысячы кантактных асоб — патэнцыйных крыніц інфекцыі. Для паловы з іх, дарэчы, медыцынскае расследаванне ўжо завершана. І гэта дазволіла прадухіліць сотні заражэнняў.

**Паліклінікі і бальніцы да 10 мая працуюць у змененым рэжыме — у гэтыя выхадныя яны адчынены, гэтаксама як 1, 2 і 3 мая.**

Магчымасці лабараторнага тэсціравання пастаянна пашыраюцца.

— Больш за 30 лабараторый працуюць сёння ў кругласутачным рэжыме. Да дыягностыкі падключаны і прыватныя медыцынскія цэнтры. Лабараторыі працуюць ва ўсіх абласцях, тэст-сістэм дастаткова, бо пачата ўласная вытворчасць. За апошнія суткі выкананы 8281 тэст, а пачыналі мы з адной лабараторыі і 300 тэстаў у суткі.

### 12,7 % захварэлых паправіліся

Алена Богдан расказала, што ў цэлым сітуацыю можна ахарактарызаваць як кантраляваную. У бальніцах зараз праходзяць лячэнне 4733 пацыенты з пацверджаным дыягназам COVID-19. Бессімптомныя і лёгкія формы цяпер лечаць дома. Гэтым займаюцца выязныя брыгады паліклінік, якія аснашчаны сродкамі аховы, пульсаксіметрамі і маюць магчымасць забору мазкоў. Цяжкіх пацыентаў пераводзяць на абласны ўзровень і ў Мінск. Пад асаблівай увагай, у тым ліку і на апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх, знаходзяцца 114 чалавек. Усім ім праведзены кансіліумы.

— Дзякуючы мерам, якія прымаюцца, удаецца не дапусціць лавінападобнага росту колькасці захварэлых. 12,7 % пацыентаў ад усіх выяўленых з COVID-19 паправіліся. Для лячэння прымяняюцца ўсе напрацоўкі, што ёсць у свеце. Мы маем прэпарат імард, на наступным тыдні чакаецца пастаўка авігану. Наша РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій падрыхтавала ўласны праект па лячэнні хворых імуннай плазмай. Такім чынам 25 донараў выратавалі жыцці васьмі чалавек. Гэтая работа працягнецца, і мы звяртаемся да ўсіх, хто паправіўся, дапамагчы іншым.

Алена Богдан выказала спачуванні блізкім памерлых з каранавіруснай інфекцыяй:

— На жаль, 63 чалавекі не ўдалося выратаваць. Мы прыносім спачуванні іх родным і блізкім. Паверце, мы зрабілі ўсё магчымае.

### У рэзерве яшчэ 9,5 тысячы ложкаў

Спецыяліст звярнула ўвагу, што амаль ва ўсіх рэгіёнах назіраецца прагназаваны рост колькасці пнеўманій.

— Асцярожна скажу, што па Віцебскай вобласці сітуацыя стабілізуецца. На працягу апошніх дзён мы назіраем пэўнае змяншэнне.

Намеснік міністра акцэнтавала ўвагу на тым, што рэсурсаў сістэмы аховы здароўя ў краіне дастаткова. Для барацьбы з каранавірусам прадугледжана 14 % ад усяго ложкавага фонду. Пакуль занята толькі палова. У рэзерве знаходзіцца яшчэ 9,5 тысячы ложкаў, з іх больш за 600 аснашчаны апаратамі штучнай вентыляцыі лёгкіх. У барацьбе з COVID-19 задзейнічана да 18 % урачоў і сярэдняга медперсаналу.

### Бальніцы і паліклінікі ў выхадныя адчыненыя

— Напярэдадні доўгіх выхадных дазвольце мне зноў звярнуць увагу на захаванне мер асабістай бяспекі. Мы настойліва просім не наведваць сваіх пажылых блізкіх, не з'язджацца з усёй краіны, каб сустрэцца са сваякамі сталага веку і пасядзець на могілках. Мы як урачы разумеем, што ў іх ужо ёсць хранічныя хваробы, і каранавірусная інфекцыя можа істотна пагоршыць іх стан здароўя, — звярнула ўвагу Алена Богдан.

Намеснік міністра праінфармавала, што паліклінікі і бальніцы да 10 мая працуюць у змененым рэжыме — у гэтыя выхадныя яны адчынены, гэтаксама як 1, 2 і 3 мая.

— Пры ўзнікненні сімптомаў тэлефануйце ў паліклініку, звяртайцеся ў прыёмны пакой бальніцы, там працуюць урачы, і вам акажуць неабходную медыцынскую дапамогу. Памятайце, што мы, медыкі, застаёмся на рабоце дзеля вас. І просім вас не рабіць лішнія паездкі, не пакідаць свае раёны дзеля нас, — папрасіла Алена Богдан.

**Алена КРАВЕЦ.**


**РУП «Торговый дом «Восточный»**
**извещает о проведении 28.05.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-9315 общей площадью 37,6 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Горбацевичский с/с, д. Отрошковичи, 15. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом № 15. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 720882009101000002, площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 4 752,00 бел. руб, размер задатка – 475,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-20101 общей площадью 554,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Портовая, 16. Назначение: здание многоквартирного жилого дома, наименование: двухэтажное кирпичное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000010000076, площадью 0,2704 га. **Начальная цена продажи – 7 061,04 бел. руб, размер задатка – 706,10 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-50124 общей площадью 677,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Владимира Комарова, 9. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: магазин «Хозяйственный». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100001002934, площадью 0,1823 га. **Начальная цена продажи – 420 300,00 бел. руб, размер задатка – 42 030,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное сроение с инвентарным номером 311/С-48184 общей площадью 187,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Дмитрия Ковалева, 130/1. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: здание магазина. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 320850100012000129, площадью 0,0222 га. **Начальная цена продажи – 64 800,00 бел. руб, размер задатка – 6 480,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Недвижимое имущество: баржа-площадка для перевозки навалочных и тарно-штучных грузов «Р-0562»; регистровый номер Б-6684; год постройки — 1989; проект №775; порт приписки — филиал РТУП «Белорусское речное пароходство», речной порт Гомель. **Начальная цена продажи – 280 800,00 бел. руб, размер задатка – 28 080,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Единый объект недвижимого имущества в составе:

1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 601/U-23461 общей площадью 574,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: гостиница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047, площадью 2,0197 га.

2. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 601/U-23463 общей площадью 46,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: здание контрольно-пропускного пункта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047, площадью 2,0197 га.

3. Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-23695, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование: артезианская скважина. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047, площадью 2,0197 га.

4. Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-23696, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, 1. Назначение: сооружение специализированное энергетики, наименование: трансформаторная подстанция. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623284505601000047, площадью 2,0197 га.

**Начальная цена продажи – 204 120,00 бел. руб., размер задатка – 20 412,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-31282 общей площадью 1 107,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Фрунзе, 17. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: склад-ангар запчастей. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100003002189, площадью 0,7684 га. **Начальная цена продажи – 266 400,00 бел. руб., размер задатка – 26 640,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Машино-место № 15 с инвентарным номером 500/D-798201859, площадью 14,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-159. **Начальная цена продажи – 17 712,00 бел. руб., размер задатка – 1 771,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Машино-место № 30 с инвентарным номером 500/D-798201873, площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-173. **Начальная цена продажи – 15 984,00 бел. руб., размер задатка – 1 598,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Машино-место № 46 с инвентарным номером 500/D-798201889, площадью 12,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-189. **Начальная цена продажи – 11 772,00 бел. руб., размер задатка – 1 177,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Машино-место № 54 с инвентарным номером 500/D-798201896, площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-196. **Начальная цена продажи – 11 448,00 бел. руб., размер задатка – 1 144,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 28.05.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений – 25.05.2020 в 15.00.**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 28 мая 2020 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 (17) 378 87 02; +375 (17) 378 87 03; +375 (44) 763 62 63.**

# АБЕДЫ АД ЧЫСТАГА СЭРЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Магілёве шмат хто займаецца дабрачыннасцю: настаўнікі, напрыклад, шыюць маскі для медперсаналу. А вось «Мяса&Лаваш» робіць для медыкаў смачныя абеды.

«Мы ўпэўнены на сто працэнтаў, што ніхто, акрамя медыцынскіх работнікаў, не зможа перамагчы пандэмію. Іх трэба падтрымаць. Многія з іх не маюць часу не толькі каб нармальна выспацца, але і каб забяспечыць сябе паўнавартасным абедам. Жыхары Магілёва, без вас мы не справімся! Нам патрэбна ваша дапамога, каб быць на паверхні і бясплатна карміць персанал бальніцы. Нашых уласных рэсурсаў хопіць прыкладна на два тыдні». Гэты заклік з'явіўся на старонках міні-кавярні ў сацсетках 3 сакавіка. Ужо канец красавіка, а справа жыве. Бо ёсць рэальная падтрымка.

— У пачатку сакавіка мы зачыніліся для звычайных наведвальнікаў і працуем выключна на дапамогу медыцынскім установам, — кажа **саўладальнік «Мяса&Лаваш» Павел ЕМЯЛЬЯНЦАЎ.** — Нашы супрацоўнікі не адыходзяць ад пліты да 12 гадзін у суткі, але сумленне не дазваляе нам заставацца ўбаку. Некаторыя ўрачы ўжо сёння працуюць суткамі, а ў будучым, хутчэй за ўсё, будуць і жыць у бальнічных умовах. Мы ведаем, што робім усё правільна, бо бачым вочы гэтых людзей. Адна справа, калі іх падтрымлівае дзяржава, і зусім іншая, калі жыхары.

Фінансавыя магчымасці кавярні абмежаваныя. І толькі тая падтрымка, якая сёння існуе, не дае збавіць тэмпы. Прадпрымальнікі арганізавалі збор грошай на платформе MolaMola, менавіта на іх яны цяпер і купляюць усё неабходнае для абедаў. Становіцца больш і тых, хто проста падвозіць прадукты. «Дапамагаюць хто агуркамі, хто мясам, хто грашыма», — усміхаецца Павел. Было такое, што прыносілі кветкі, а таксама самаробны хлеб. І гэта пайшло ў ход. Бо сняданак з букетам кветак — гэта яшчэ і сімвалічна.



Сёння ў меню — салат з агародніны.

Дапамога збоку дазваляе рабіць меню разнастайным і па-сапраўднаму дамашнім. У сацсетках можна прасачыць, што мае на абед медперсанал. Сёння, напрыклад, капуста тушаная з мясам, гарохавы суп з вяндлінай, салат з агародніны. Заўтра будзе нешта кардынальна іншае — напрыклад, юшка, пюрэ з катлетай і які-небудзь зусім новы салат. На тыдні сем розных страў — супоў, гарачых, салатаў.

Уражвае тое, як хутка кавярня перапрафілявалася і стала на новыя рэйкі. Яе фармат не прадугледжваў прыгатаванне першых страў, салатаў, гарачага. Установа адкрылася летась і спецыялізавалася на прыгатаванні шаўрмы і бургераў — ежы, якая робіцца проста і хутка. Да каранавіруса тут нават не думалі, што будуць рабіць паўнавартасныя абеды. Давялося часткова набываць абсталяванне — той жа параканвектамат, пліты.

Сілы невялічкай кавярні абмежаваныя, усяго пяць чалавек. Сёння на змене Павел, Уладзіслаў і Віктар. Уладзіслаў працуе ў Мінску, але рэстараны цяпер зачыніліся і ён прыехаў дапамагаць магілёўскім сябрам.

— Я цалкам падтрымліваю іх намер, — кажа ён. — У маёй сям'і таксама ёсць медыкі, я ведаю гэтую сітуацыю не па словах. Шмат урачоў працуюць сёння без выхадных і нават адпачынку. Мы робім добрую справу — кормім, падтрымліваючы іх жыццёвыя сілы.

Рабочы дзень пачынаецца а восьмай гадзіне раніцы, каб да абеду паспець усё прыгатаваць і развезці па адрасах. У другой палове дня ідзе нарыхтоўка прадуктаў для заўтрашніх страў, а затым поўная дэзынфекцыя кухні і ўсіх астатніх памяшканняў. Працуюць хлопцы выключна ў масках, бо стэрыльнасць павінна быць перш за ўсё. Работа заканчваецца прыкладна каля васьмі-дзевяці гадзін вечара. Але ўсё залежыць ад складанасці меню: можна справіцца і да шасці гадзін, а можна правалтузіцца да дзесяці-адзінаццаці. Пэўны час абеды гатаваліся яшчэ для магілёўскай бальніцы № 1 і гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, але фізічна ўсё не ахопіш. Цяпер на пастаянным абслугоўванні міні-кавярні толькі інфекцыёнка і лабараторыя ЦГЭіГЗ — самыя, так бы мовіць, «гарачыя» пункты: тыя, дзе засяродзіўся гэты каварны каранавірус.

— Мы працуем не дзеля піяру, як думаюць некаторыя, — кажа Павел. — Мы робім гэта ад душы. Нас натхняюць тыя людзі, якія знаходзяць магчымасці і сродкі забяспечваць медыцыну ўсім неабходным. На платформе MolaMola шмат такіх — чытаеш і захапляешся. Адны прывезлі медыкам рэспіратары, другія — спецкасцюмы, трэція — маскі. Прыкладаў колькі заўгодна. Калі казаць пра харчаванне ўрачоў, то ім на змену трэба ўзяць тры-чатыры ссабойкі, каб паўнавартасна паесці. Мы ведаем, што іх у бальніцы кормяць, але ці гэта ежа? Пярлоўка і катлета напалову з батонам для чалавека, які ўвесь час на нагах ды ў такіх напружаных умовах, не вельмі добрая падтрымка. Мы даём ім магчымасць падсілкавацца больш грунтоўна.

У нашых сілах забяспечыць дзве ўстановы аховы здароўя. Было б добра, калі б да нас яшчэ нехта далучыўся. Рэальная патрэба — каля 1000 порцый. Нам адным гэта не пацягнуць. Раней мы ніколі не займаліся дабрачыннасцю і не ведалі, наколькі гэта важна. Магчыма, калі пандэмія скончыцца, мы працягнем гэтую дзейнасць у нейкім іншым выглядзе. А сёння мы дзякуем усім тым, хто нас падтрымлівае, і разлічваем на дапамогу. У нас ёсць вялікая неабходнасць і ў прадуктах, і ў сродках для іх набыцця. Калі маеце жаданне далучыцца, нас можна знайсці ў Instagram або звязацца па тэлефоне +375 29 110 68 85.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

Ініцыятыва

# ТРЫ ЖАНЧЫНЫ ПАД АКНОМ ШЫЛІ МАСКІ ВЕЧАРКОМ

**Ала сядзела за сталом і ўважліва разглядала свой палец. Суседка часам заходзіць да мяне, каб пагаварыць і адцягнуцца ад хатніх спраў. Я падала каву і запытальна на яе паглядзела.**

— Палец баліць, — паціскаючы плячыма, сказала яна. — Шыць не ўмею, вось і выразаю. З нязвычкі да такой работы палец разбалеўся. Валя з чацвёртага пад'езда з пляменніцай маскі шыюць — трэба дапамагчы.



Аляксандра ШЧОЛАКАВА, Валянціна МАКАРЧЫК і Ала РУСАКОВІЧ рыхтуюцца шыць другую партыю масак.



Я не здзівілася. Тысячы людзей хочуць быць карыснымі падчас пандэміі. Гэтае жаданне дапамагаць нармальнае для псіхічна здаровых людзей. Я ўжо стала прывыкаць да таго, што беларусы аб'ядналіся, каб аказаць дапамогу медыкам і сталым людзям, але для мяне стала поўнай нечаканасцю паведамленне ў вайбер-групе ад той самай суседкі Валянціны. Яна прапаноўвала ўсім суседзям разабраць маскі, якія ветліва пакінула ў сваім пад'ездзе на першым паверсе. Яна не вылучала бедных, багатых, маладых ці пажылых — любы мог прыйсці і ўзяць маску для сябе і сваіх дзяцей.

— На самай справе мяне проста абурыла паведамленне маіх суседзяў пра тое, што хтосьці з іх знайшоў маскі «за бясцэнак» у адной з крам — за 4 рублі 50 капеек, — расказвае, з чаго пачыналася яе ініцыятыва, Валянціна Макарчык. — Я ведала іх рэальны кошт і разумела, што многія сем'і ў нашым доме шматдзетныя і лішніх грошай на куплю такіх дарагіх масак у іх проста няма. А шматразовыя маскі трэба мяняць кожныя 2-3 гадзіны. Дзе ж столькі грошай узяць людзям? Да таго ж у той час ні ў крамах, ні ў аптэках іх часта проста не было.

Як толькі Міністэрства аховы здароўя забіла трывогу, а ў свеце абвясцілі пандэмію, Валянціна таксама пажадала быць карыснай і дапамагчы медыкам. Жанчына ўмее шыць і хацела прымяніць свае навыкі, таму вырашыла далучыцца да валанцёраў, якія гэтым ужо займаліся і ў якіх былі пэўныя дамоўленасці. Літаральна за пяць хвілін у «Інстаграме» Валянціна знайшла патрэбных людзей, а менавіта Кацярыну Гардзееву, якая арганізавала шыццё масак у сваім атэлье і развозіла іх па бальніцах. Валанцёры змянялі адно аднаго, каб забяспечыць нашых дактароў неабходнымі сродкамі аховы. Сярод іх была і Валя. У дзень шылі па 300—500 масак. Працавала яна старанна. Потым выявіла, што масачны дэфіцыт дабраўся і да простых людзей. Валя тады абышла восем аптэк, і ні ў адной з іх не было масак, а ў крамах яны сталі толькі-толькі з'яўляцца за вялікія грошы, хоць на самай справе метр тканіны, з якой іх шыюць, каштуе прыкладна 4 рублі. Як валанцёр Валя шыла маскі з марлі, бо праз больш шчыльную тканіну дактарам цяжка дыхаць. Адправілася ў краму менавіта па марлю, але там яе чакала расчараванне — марлі не было, ужо даўно раскупілі! Тады жанчына прыняла рашэнне набыць вафельную тканіну, якая ёй здалася найбольш прыдатнай для гэтых мэт. Каштавала тая 3,50 за метр. Купіла на 25 рублёў: для дарослых з нейтральным малюнкам, а для дзіцячых масак — весялейшую. Работы аказалася шмат, таму на дапамогу прыйшлі яе пляменніца Аляксандра і сяброўка-суседка Ала, якой, дарэчы, давялося не шыць, а выразаць будучыя маскі з тканіны. Валя перажывала: а што, як людзям не спадабаюцца маскі, што, як яны ўжо закупілі іх сабе і ім больш не трэба? Але справа была зроблена, і таму яна сабрала пакеты з маскамі, паставіла іх у сваім пад'ездзе на першым паверсе і напісала аб'яву ў чаце. Праз пару гадзін у пакетах не засталося ніводнай маскі.

— Разумееце, калі я ўбачыла пустыя пакеты, то была проста шчаслівая, — кажа Валянціна. — Наша з дзяўчатамі праца была карысная для людзей! Цяпер мы шыем ужо новую партыю масак. Разумееце, такія ініцыятывы аб'ядноўваюць нас і робяць трошачкі дабрэйшымі. Я чытаю прэсу і бачу, як дактары дзякуюць грамадству за падтрымку. Мне здаецца, так мы становімся сапраўднай супольнасцю і зможам разам перажыць любыя цяжкасці.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ЧАС ДАПАМАГАЦЬ

## Выручка ад новай серыі гадзіннікаў «Прамень» пойдзе беларускім медыкам

**Днямі Мінскі гадзіннікавы завод запусціў у продаж спецыяльную серыю гадзіннікаў. Усе атрыманыя сродкі ад рэалізацыі гэтай серыі пойдуць на дабрачынны рахунак Міністэрства аховы здароўя.**

На цыферблаце гадзіннікаў новай мадэлі выгравіраваны надпіс: «Мая дапамога ўрачам супраць COVID-19». На заднім вечку корпуса вытворца змясціў словы падзякі медыцынскім работнікам на 17 мовах. Акрамя беларускага «дзякуй», там можна знайсці англійскае «thank you», украінскае «дякуємо», французскае «merci», польскае «dziękuję» ды іншыя варыянты. Латуневы корпус дапаўняе яркі чырвоны нейлонавы раменьчык, які стане адметным знакам неабыякавага ўдзельніка акцыі. Мадэль устойлівая да ўздзеяння вільгаці: гадзіннік не баіцца кропель дажджу і пырскаў ад мыцця рук.

«Выпускам гэтых гадзіннікаў мы хочам сказаць «дзякуй» медыцынскім работнікам, якія ў гэты няпросты час ратуюць нашы жыцці. Мы назвалі мадэль «Час дапамагаць». Цяпер той час, калі многія беларусы імкнуцца зрабіць свой унёсак у дапамогу медыкам: хтосьці шые ахоўныя маскі і касцюмы, хтосьці гатуе і перадае гарачыя абеды, нехта ладзіць дабрачынныя канцэрты. Гэтыя гадзіннікі — яшчэ адна магчымасць матэрыяльна дапамагчы нашым урачам, а таксама напамін для нас, што пры кожным руху стрэлак цыферблата медыкі рызыкуюць сваімі жыццямі, каб захаваць нашы», — адзначае **арт-дырэктар завода Іван КРАЎЧЭНЯ.**



Для завода гэтая дабрачынная акцыя — не першая ў перыяд каранавіруснай пандэміі. У сакавіку «Прамень» ужо адгукнуўся на запыт аб дапамозе ад медыкаў 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя М. Я. Саўчанкі і пералічыў сродкі на закупку шматразовых ахоўных медыцынскіх касцюмаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


## ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «БелДрев»** (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **11 мая 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4 этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомат, сверлильный станок FM 400 Morbidelli, инв. № 485 | 7 920,00 |
| 2 | Вакуумный облицовочный пресс ПО-2500, инв. № 479 | 2 460,00 |
| 3 | Вертикальная моечная машина «Bavelloni» LV1604/20DX, инв. № 474 | 12 240,00 |
| 4 | Деревообрабатыающий центр с ЧПУ MORBIDELLI AUTHOR 660. модель U660, инв. № 313 | 21 120,00 |
| 5 | Деревообрабатывающий центр с ЧПУ MORBIDELLI AUTOR 500, инв. № 300 | 19 500,00 |
| 6 | Деревообрабатывающий центр MORBIDELLI AUTOR 504 мод. А504, инв. № 32 | 14 640,00 |
| 7 | Деревообрабатывающий центр MORBIDELLI AUTHOR660, инв. № 2630 | 21 120,00 |
| 8 | Краскоструйный промышленный принтер для печати на текстильных и прочих издел. DURST RHO P10-200, инв. № 2506 | 83 520,00 |
| 9 | Пескоструйный автомат «Fratelli Rezza» MISTRAL 120V, инв. № 472 | 12 780,00 |
| 10 | Станок для изготовления прямолинейного фацета на стекле, инв. № 5014 | 14 940,00 |
| 11 | Станок сверлильный для изг. отверстий (пазов) под петли и их устан. в меб. уст., инв. № 899 | 2 820,00 |
| 12 | Пила диск. д\распила древесины и деревесных плит-авт б/у HOLZMA "HPL11 № 477, 1999 г. в. | 11 480,00 |
| 13 | Станок форматно-раскроечный HOLZMA OPTIMAT HPP 82/43 для раскр. древ. плит № 159, 2001 г. в. | 13 760,00 |
| 14 | Стол для резки стекла Intermac Fox Shape 3700 № 5017, 2001 г. в. | 13 880,00 |
| 15 | Станок для изготовления двухконусной пружины Spuhl AM-115, инв. № 3025,1984 г. в. | 4 920,00 |
| 16 | Универсальный кромкооблицовочный станок WT-91 (MFS 503), инв. № 811, 2010 г. в. | 792,00 |
| 17 | Пресс мембранный для облицовки мебельных фасадов пленкой ПВХ Itallpress Lock-Form SS Air № 3010, 2002 г. в | 10 640,00 |
| 18 | Станок для изготовления криволинейной кромки «Bavelloni SB-10» № 115 | 6 200,00 |
| 19 | Печь промышленная эл. для меллирования стекла (для выгибания) PK-VS 1125 инв. № 2244, 2007 г. в. | 2 416,00 |

**Местонахождение – г. Гродно, ул. Карского, 2А.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 25.04.2020 г. 09.00 по 08.05.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 11.03.2020 г.



**Считать недействительным** в связи с утерей свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Зубрицкой Н.Л. № Р-0016992



## ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ООО «БелДрев»** (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 180-4Б/2017 в экономическом суде Минской области будут проведены: **27 мая 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Наименование предмета торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 330/С-11175 (склад 1), общей площадью 235,9 кв. м, капитальное строение с инв. № 330/С-11176 (здание магазина с пристройкой лит. 1, подвалом, тремя крыльцами, двумя входами в подвал, гараж, дымовая труба, два ограждения, двое ворот, калитка, три покрытия) общей площадью 1190,60 кв. м, капитальное строение с инв. № 330/С-11174 (склад № 2 с пристройкой лит. д1/см, уборная лит. 1) общей площадью 947,90 кв. м. Система отопления «Мозырь», инв. № 7013. Теплотрасса Мозырь, инв. № 7017. Скважина для воды «Мозырь», инв. № 7014, расположенные по адресу: г. Мозырь, ул. Иваненко, 13 | 878 610,60 | 615 027,42 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 400/С-88717 (Производственный корпус с хозяйственным бытовым блоком), общей площадью 3745,4 кв. м. Назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А/1. Стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2350. Стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2254 | 1 149 600,00 | 804 720,00 |
| 3 | Капитальное строение, инв. № 400/С-1323, здание специализированное энергетики (Трансформаторная подстанция, инв. № 81). Капитальное строение, инв. № 400/С-1324, здание специализированное энергетики (склад негорючих материалов общей площадью 168,3 кв. м), Капитальное строение, инв. № 400/С-50305, общей площадью 672,8 кв.м. Производственный корпус № 2, инв. № 93, Здание специализированное складов, с инв. № 400/С-57474, торговых баз, баз МТС (Склад готовой продукции № 2, инв. № 195) общей площадью 1412,9 кв. м, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | 497 380,00 | 348 166,00 |
| 4 | Объект недвижимости – в составе капитального строения с инв. № 400/С-28567 (Проходная) общей площадью 15,2 кв. м (А1-материал – асфальтобетон, площадь – 127,1 кв. м), пешеходной части (А2-материал – асфальтобетон, площадь 6,9 кв. м), ограждения (Б1-материал – металлическое, высота – 1,7 м, площадь – 9,2 кв. м), ворот (б2-материал металлические решетчатые, распашные, высота – 2,0 м, площадь – 15,70 кв. м), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20. Капитальное строение с инв. № 400/С-49752 (административное), общей площадью 432,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002006353 по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 22 | 106 080,00 | 74 256,00 |

**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 25.04.2020 г. 09.00 по 26.05.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Обременения в отношении имущества отсутствуют. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов (подробнее на BELTORGI.BY). Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее десяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.


# НЕ БРАЦЬ НЕПАТРЭБНЫЯ КРЭДЫТЫ І ПРАДУКТЫ СКРЫНЯМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ёсць універсальная парада ад фінансіста Міхаіла Грачова — захоўваць сродкі ў залежнасці ад мэты зберажэння ў розных валютах. Ёсць блізкі гарызонт захоўвання, сярэдні і далёкі.

Блізкі — калі вы на працягу некалькіх месяцаў плануеце сабраць пэўную суму на куплю, напрыклад, халадзільніка. У гэтым выпадку грошы раяць трымаць выключна ў беларускіх рублях.

Калі ў вас гарызонт планавання складае 1—3 гады і вы плануеце куплю аўтамабіля або нерухомасці, то грошы лепш захоўваць у замежнай валюце. Тут кошык зручна падзяліць напалову: на еўра і долары. Банкаўская прыбытковасць у гэтых валютах і там, і там аднолькавая.

Калі гарызонт вашага планавання зусім далёкі — 10—15 гадоў па прынцыпе «пакінуць унукам» або «сыну на вяселле», — то лепш укладваць грошы ў нерухомасць або ў ліквідныя каштоўныя паперы.

Дарэчы, захоўваць наяўнасць дома (на дачы, у машыне ці яшчэ дзе-небудзь), хоць бы і ў цвёрдай замежнай валюце, у крызіс можа быць больш небяспечна з прычыны росту ліку крадзяжоў і рабаванняў.

### Не купляйце валюту на піку курсу

Цяпер курсы валют больш схільныя да ваганняў. Гэта ў цяжкія 90-я гады рубель толькі падаў, а наступная зарплата магла быць у паўтара раза большай за ранейшую і выдавалася новымі купюрамі. Цяпер рублі маюць пэўную каштоўнасць і пасля панік на рынках (кароткачасовых і не вельмі, звязаных з нафтай ці золатам) часам зноў даражэюць.

Першапачатковыя курсы рубля да долара і еўра, праўда, не вяртаюцца, але адкат на пэўную суму цалкам магчымы і перыядычна назіраецца. І гэтыя некалькі працэнтаў на буйной суме «крадуць» або «дораць» зарплату за некалькі дзён ці тыдняў.

І яшчэ: не варта купляць лішнюю валюту. У моманты абвалу рубля, «на істэрыцы», можна ўкласці ў долары ўсё да апошняй капейкі. Але потым акажацца, што няма грошай купіць хлеба, аплаціць камунальныя паслугі або леташні крэдыт. І будзе вельмі крыўдна здаваць валюту назад ужо па меншым курсе. Цяпер гэта менш прыкметна, але ў мінулыя гады пры вялікіх ваганнях валют на рынку розніца паміж цаной пакупкі і продажу замежных грошай станавілася большай, чым у спакойныя часы.

### Не варта тэрмінова купляць каштоўнасці і бытавую тэхніку

Розніца паміж цаной продажу і зваротнага выкупу залатых, сярэбраных і плацінавых зліткаў значна большая, чым розніца паміж курсамі куплі, продажу валюты. Часам зліткі выкупляюць за палову прадажнай цаны.

Наступны важны момант — кошт каштоўных металаў у айчынных банках залежыць ад сусветных цэн. У крызіс золата звычайна даражэе, але бываюць і выключэнні. Каштоўнасці наогул не антыкрызісны інструмент — у найлепшым выпадку яны могуць стаць прыемным бонусам на старасць або для перадачы ў спадчыну.

Звычка прыкупіць адразу некалькі дарагіх рэчаў засталася ў нас з часоў татальнага дэфіцыту. Тады сапраўды можна было купіць па старой рублёвай цане халадзільнікі і жаночыя боты, потым прадаць іх па аб'явах і нічога не страціць. Цяпер гэтага няма. Людзі прывыклі да гарантыі і сэрвісу, і халадзільнік з гаража за пачатковы кошт ніхто не купіць. Хоць кажуць, што прадпрымальныя бабулі яшчэ захоўваюць у кладоўках відэамагнітафоны, купленыя ў канцы 90-х, каб падарыць унукам на вяселле...

### Купляць жыллё толькі з халоднай галавой

Цана кватэр, гаражоў і дач часцей за ўсё фіксуецца ў доларах. Купляецца нерухомасць толькі ў рублях, але лічыцца яна выключна ў «зялёных». Шанц нешта выгадна купіць за рублі перад самым абвалам курса, вядома, ёсць. Але калі крызіс ужо ідзе, у людзей менш упэўненасці, каб укладваць у бізнес, таму попыт і цэны на нерухомасць прасядаюць. Пра гэта сведчаць усе папярэднія крызісы: назіраецца падзенне кошту квадратнага метра ў валюце як для жылой нерухомасці, так і для камерцыйнай.

Таму ніякага сэнсу ў паспешлівай куплі эксперты не бачаць: лепш дачакацца цэнавага дна. Да таго ж кватэры, дамы і нават гаражы — гэта дадатковыя бягучыя выдаткі: камунальныя паслугі, падаткі, рамонт і іншае. У крызіс — яно табе трэба?

### Лішнія бываюць не толькі тавары, але і харчы

Цяпер мы жывём у іншым свеце, дзе машына — гэта не ўкладанне капіталу, а просты сродак перамяшчэння і ў некаторых выпадках — зараблянне грошай. Але аўто заўсёды і прычына абавязковых выдаткаў, такіх як абслугоўванне, тэхагляд і афармленне. Купіць і праз некалькі гадоў прадаць аўтамабіль практычна па той жа цане атрымлівалася толькі ў савецкі час. Сёння ўсе машыны, за выключэннем некаторых калекцыйных узораў, толькі таннеюць, і часта хутчэй за інфляцыю.

Вялікія запасы — справа такая ж спрэчная, як запланаванае атлусценне на выпадак голаду. Усё назапасіць на ўсе выпадкі жыцця не атрымаецца, але рухацца ў фізічным і фінансавым плане будзе складаней. Мой сусед па паверсе прыкупіў аж 20 кілаграмаў свініны. Усё мяса ў маразільнік не ўлезла, давялося рабіць тушонку. Але гэтыя кансервы атрымаліся не для працяглага захоўвання. Усе выхадныя толькі іх і еў. Нават на вуліцу не хадзіў — не было часу.

Дарэчы, калі ўжо рыхтавацца да крызісу, грэчка — адна з самых дарагіх круп. Аўсянка значна таннейшая, ячныя крупы — тым больш. Тэрмін захоўвання ў іх паўтара года, а рознага роду каш хуткага прыгатавання — паўгода і менш.

### Лепш без грошай, але людзьмі звацца

Што ж тады рабіць у час, калі насоўваецца крызіс? Калі б на гэтае пытанне былі адназначна талковыя адказы, то замест крызісаў здараліся б спакойныя структурныя перабудовы. З мінулага вопыту эксперты могуць толькі парэкамендаваць прыслухацца да некалькіх заяў.

Першае: дбайней планаваць свае выдаткі. Тое, што абавязкова спатрэбіцца, лепш купляць адразу і па самай выгаднай цане. Тое, што не асабліва трэба, не купляць нават танна. Наогул не звяртайце ўвагу на розныя гандлёвыя акцыі і зніжкавыя дні, калі тавар не ў вашым спісе.

Другое: трэба ўважліва падыходзіць да буйных купляў. Магчымыя цікавыя варыянты, але галоўнае, каб хапіла грошай на бягучыя выдаткі.

Трэцяе: у любым выпадку заставацца чалавечным. Калі для выратавання бізнесу або асабістага даходу вам давядзецца рызыкаваць іншымі людзьмі, то крызіс міне, а статус «не зусім чыстага на руку» застанецца да канца жыцця. Але мы не такія, праўда?

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# НАДЗЕЙНАЯ ВАРТА БЕЛАРУСКАГА НЕБА

**Красавік — месяц, калі сваё прафесійнае свята адзначаюць войскі супрацьпаветранай абароны. Гістарычна яно паходзіць ажно з 1975 года, калі адпаведную пастанову прыняў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР. Што да Беларусі, то ў наш каляндар Дзень супрацьпаветранай абароны афіцыйна вярнуўся ў 1998 годзе. Як і за савецкім часам, датай была абрана другая нядзеля красавіка.**

Беларускую ж сталіцу з паветра прыкрывае 15-я зенітная ракетная брыгада, якая месціцца непадалёк ад Мінска. Аб'ект гэты рэжымны, і трапіць на яго тэрыторыю не так проста. Асабліва ў сувязі з апошнімі падзеямі вакол распаўсюджвання каранавіруса і звязаных з гэтым рызык.

**Упершыню Вольга Садоўская выйшла на дзяжурства ў статусе памочніка аператыўнага дзяжурнага прыблізна тры з паловай гады таму. І стала свайго кшталту першапраходцам — да таго памочнікамі былі толькі мужчыны.**

Што ж, спадзяёмся, будзе яшчэ нагода пабываць там, і не адна. Галоўнае — каб нармалізавалася абстаноўка. А пакуль што запытаемся ў двух афіцэраў брыгады пра тое, як яны служаць на вельмі адказных пасадах, усведамляючы, што ад іх рашэнняў падчас баявых дзяжурстваў залежыць мір і спакой двухмільённага горада і яго ваколіц.

## У інжынеры — з... бібліятэкара



Часам жыццёвыя абставіны складваюцца так, што трэба мяняць прафесію. У **лейтэнанта Вольгі САДОЎСКАЙ** даволі пакручасты лёс. Апошнія трынаццаць гадоў яна служыць у вайсковай часці 30151. Цяпер займае пасаду старшага інжынера аддзялення баявога кіравання каманднага пункта.

— З дзяцінства вабіла ваенная тэматыка, але ў тыя часы я не ведала, як жа трапіць у гэтыя шэрагі. Інтэрнэту з такімі магчымасцямі, як цяпер, яшчэ не было. Спытаць таксама не было каго — тыя нешматлікія знаёмыя, якія мелі дачыненне да службы, маглі расказаць толькі пра ўнутраныя войскі. А пасля я пазнаёмілася са сваім будучым мужам, які тады быў яшчэ курсантам Ваеннай акадэміі. Пасля таго як ён атрымаў размеркаванне, я зразумела, што стала на адзін крок бліжэйшай да мары.

Але да яе здзяйснення прайшло яшчэ некалькі гадоў. Вольга некаторы час адпрацавала ў Гродне загадчыцай дзіцячага філіяла бібліятэкі, затым перавялася ў абласную навуковую бібліятэку ў аддзел маркетынгу. Думкі пра войска ўсё не адпускалі. І нарэшце стала ясна: гадзіна «Х» прабіла.

— На кантракт я прызвалася звычайнай тэлефаністкай у Гродне. Праз тры гады мне прапанавалі ўзначаліць склад ваенна-тэхнічнай маёмасці. Гэта пасада прапаршчыцкая. А ў часць, дзе служу цяпер, трапіла пасля таго, як адслужыла некаторы час у сувораўскім вучылішчы. Наогул у войсках супрацьпаветранай абароны жанчын вельмі мала. Так склалася гістарычна, пэўна, што даволі складаная тэхніка і радыёапаратура патрабуюць пераважна мужчынскага ўдзелу. Ды і апроч непасрэдных функцыянальных абавязкаў ёсць яшчэ спецыяльныя.

Вайсковая часць 30151 пастаянна выконвае задачы баявога дзяжурства. І гэта накладвае істотны псіхалагічны адбітак — падчас сутачных вахтаў на кожным разліку ляжыць вялікая адказнасць. Асабліва — на памочніку аператыўнага дзяжурнага. Упершыню Вольга Садоўская выйшла на дзяжурства ў такім статусе прыблізна тры з паловай гады таму. І стала свайго кшталту першапраходцам — да таго памочнікамі былі толькі мужчыны.

— Я хвалявалася, як успрымуць мяне на цэнтральным камандным пункце ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. Вось як угадаць рэакцыю там, калі яны пачуюць не мужчынскі голас, а жаночы?

Вольга Садоўская прызнаецца, што калі б муж не абраў ваенную сферу дзейнасці, то і сама б яна не пайшла гэтым шляхам. Без жывога прыкладу перад вачыма перавучвацца ледзь не з нуля — задача няпростая. Тым больш што армейскае жыццё пакідае не так шмат вольнага часу, а адказнасці накладвае вельмі шмат.

— Разам з сям'ёй стараемся бавіць нячастыя выхадныя на прыродзе, перыядычна выязджаем на дачу, да сваякоў у Гродна. Для нас гэта — найлепшы адпачынак і своеасаблівая псіхалагічная разгрузка.

## «Востраў»... на колах



Цэнтр штаба воінскай часці — стацыянарны камандны пункт. Функцыянал каманднага пункта — сабраць, прааналізаваць і апрацаваць інфармацыю, а таксама размеркаванне і ўказанне цэляў.

На чале каманднага пункта — **намеснік начальніка штаба па баявым кіраванні падпалкоўнік Раман ЛУК'ЯНАЎ.**

— Мяне заўжды цягнулі да сябе дзве рэчы — неба і камп'ютары. Вось і атрымаўся такі цікавы «сплаў». Спецыяліст, які служыць у войсках супрацьпаветранай абароны, проста апрыёры мусіць пастаянна вучыцца і быць гатовым дзейнічаць у цэйтноце, імкліва і правільна праводзіць разлікі па складаных формулах. Таму выпадковых людзей у нас няма. Хто разумее, што гэта «не яго», — адсейваецца вельмі хутка.

Мабільны пункт «Паляна» базуецца на шасі МЗКТ. Дзяжурны баявы разлік складае каля дзесяці чалавек. Дарэчы, «Паляна» вельмі добра кеміць сваім электронным «мозгам». Ён здольны адначасова апрацоўваць некалькі соцень аб'ектаў. Надзейна трымаць кантакт з іншымі падраздзяленнямі мабільнаму пункту дапамагае спецыяльная машына сувязі.

**«Спецыяліст, які служыць у войсках супрацьпаветранай абароны, проста апрыёры мусіць пастаянна вучыцца і быць гатовым дзейнічаць у цэйтноце, імкліва і правільна праводзіць разлікі па складаных формулах. Таму выпадковых людзей у нас няма. Хто разумее, што гэта «не яго», — адсейваецца вельмі хутка».**

Стваральнікі «Паляны» паклапаціліся і пра камфорт тых, хто на ёй будзе працаваць. У залежнасці ад таго, якая тэмпература за бортам, можна скарыстацца кандыцыянерам або сістэмай ацяплення Webasto. Кунг зроблены з такім разлікам, каб яго можна было маскіраваць і перавозіць па дарогах краіны без праблем. Там жа ёсць і магутныя фільтры, якія павінны ачышчаць паветра, калі праціўнік выкарыстае зброю масавага паражэння.

Адным словам, не машына, а цэлы аўтаномны востраў! Але наколькі складана на ёй працаваць?

— У нас на дзяжурства заступаюць і кадравыя афіцэры, і салдаты тэрміновай службы. А што да тэрміну навучання... Каб з навабранца падрыхтаваць спецыяліста, патрэбен прыкладна месяц рэгулярных заняткаў, якія пачынаюцца адразу пасля ваеннай прысягі.

«Паляна» паўдзельнічала і ў комплекснай праверцы Узброеных Сіл, якая праводзілася ў пачатку 2020 года. Апаратны комплекс і яго разлік павінны былі адсачыць палёты кантрольных цэляў у пункце пастаяннай дыслакацыі. Раман Лук'янаў зазначыў, што іспыт яго падначаленыя здалі добра. А гэта значыць, што наша неба — пад надзейнай аховай.

**Фота дадзена часцю 30151.**

## АФІЦЭРЫ БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ ПЕРАЛІЧЫЛІ НА ДАБРАЧЫННЫ РАХУНАК ЗВЫШ BR130 ТЫС.

«З ініцыятывай арганізаваць збор сродкаў сярод афіцэраў для садзейнічання ахове здароўя насельніцтва на мінулым тыдні выступілі афіцэры Ваеннай акадэміі. Прапанову падтрымалі ва ўсіх воінскіх часцях», — расказалі ў Мінабароны.

Дабрачынны рахунак адкрыты ў Рэспубліканскім цэнтры арганізацыі медыцынскага рэагавання. Сродкі, якія паступаюць сюды, размяркоўваюцца ў адпаведнасці з патрэбамі канкрэтных устаноў аховы здароўя па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

## ФЛЭШМОБ У ПАДТРЫМКУ МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ




Фота БелТА.

Ваеннаслужачыя 38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай Венскай Чырванасцяжнай дэсантна-штурмавой брыгады 22 красавіка арганізавалі флэшмоб у падтрымку медыцынскіх работнікаў. На пляц вайсковай часці выйшла амаль уся брыгада. Вайскоўцы выстраіліся такім чынам, каб з вышыні чыталася фраза # ДЗЯКУЙ # ДОКТАР. Затым разгарнулі і страявым крокам пранеслі вялікае палотнішча Нацыянальнага сцяга Беларусі. Усё дзейства здымалі на квадракоптар. Затым відэа зманціравалі, каб медыцынскія работнікі змаглі ўбачыць яго на YouTube.

Каб памяталі

# ЧАС НЕАБ'ЯЎЛЕНАЙ ВАЙНЫ

## ЯК ДЗЯКУЮЧЫ ПАДЛЕТКАМ БЫЛІ ЗА ПАЎТАРА ТЫДНЯ ДА ПАЧАТКУ ВАЙНЫ АБЯСШКОДЖАНЫ НЯМЕЦКІЯ ДЫВЕРСАНТЫ

**Наш даўні сябар — жыхар Вялікай Бераставіцы — Міхаіл МАСКАЛЬЧУК даслаў нам вельмі цікавы аповед, запісаны ім са слоў яго бацькі Васіля МАСКАЛЬЧУКА.**

Усе мы ведаем дату пачатку Вялікай Айчыннай вайны — 22 чэрвеня 1941 года. Але за некалькі тыдняў да яе нямецкія самалёты пачалі ўначы раз за разам парушаць граніцу Савецкага Саюза. Яны скідвалі адзін за другім дэсанты будучых дыверсантаў. Яны павінны былі затаіцца і чакаць, пакуль па радыё не прагучыць кодавы сігнал, а пасля гэтага — спрыяць як мага большаму знішчэнню інфраструктуры і баявой сілы.

І вось на Палессі адна такая група была абясшкоджана за паўтара тыдня да першых залпаў вайны. Як гэта было? Даём слова непасрэднаму ўдзельніку тых падзей.

...Дзесьці ў пачатку мая 1941 года праўленне нашага калгаса (які месціўся ў вёсцы Камуна Любанскага раёна Мінشчыны) вырашыла адправіць двух хлопцаў і дзвюх дзяўчат у вучылішча лясной прамысловасці. Яно знаходзілася ў суседнім Жыткавіцкім раёне Палескай вобласці, у вёсцы Пасталы. Там жа быў і леспрамгас, які злучаўся чыгуначнай веткай са станцыяй Старушкі на лініі Калінкавічы — Жыткавічы — Лунінец.

Дзяўчынкі і хлопчыкі былі вельмі задаволены, а як жа інакш? У вучылішчы добра кармілі. Усе хадзілі ў прыгожым форменным адзенні. Добры інтэрнат, лазня, чыстыя пасцелі, адукаваныя выкладчыкі — пасля вясковага жыцця для нас гэта быў сапраўдны рай.

Але не наканавана было нашаму пакаленню працягнуць вучобу, парадавацца жыццю. У 1941 годзе было трывожна, адчуваўся халодны подых вайны. Людзі скуплялі соль, запалкі, некаторыя нават з'язджалі на ўсход.

...І вось у адзін з чэрвеньскіх дзён, пасля сняданку, наш выхавацель Антон Пятровіч абвясціў групе, што праз паўгадзіны мы выходзім у лес на заняткі па ваеннай падрыхтоўцы. Тэма — арыентаванне ў складаных умовах. Усім трэба было ўзяць сухі паёк, надзець паходнае адзенне. Канцавым пунктам паходу мусіў стаць Блакітны ручай.

Антона Пятровіча ўсе любілі і паважалі. І было ж за што! Акрамя таго, што гэта быў цудоўны чалавек, за яго плячыма — вялікі паслужны спіс. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, затым зампаліт пагранічнай заставы, быў на фінскай кампаніі, меў два баявыя ордэны.

Праз гадзіну мы ўжо былі ў густым сасонніку. Ад водару нават крыху кружылася галава. «Усім захоўваць цішыню і не размаўляць, не наступаць нагамі на сухастой!» — прамовіў Антон Пятровіч. Гэта было абгрунтаванае папярэджанне. Сярод людзей хадзілі пагалоскі, што немцы тады ўкідвалі з самалётаў у наш глыбокі тыл дыверсантаў-парашутыстаў, пераадзетых у чырвонаармейскую форму.

У групе з намі былі чатыры дзяўчыны — дзве з маёй вёскі і дзве з Жыткавіцкага раёна. Мы, хлопцы, каб дзяўчатам было лягчэй ісці, забралі іх заплечнікі і закінулі сабе на плечы. Імёны гэтых дзяўчат памятаю і праз дзесяцігоддзі — Марыя, Вера, Надзея і Любоў.

...Да Блакітнага ручая заставалася метраў сто. Раптам з хмызняку выскачыў велізарны лось. А ў паветры кружыліся вароны і бесперапынна каркалі. «Усім стаяць, — ціхенька загадаў Антон Пятровіч. — Захоўваць цішыню, каля ручая людзі. Маскальчук і Чарткова, хутка да мяне! А ўсім астатнім захоўваць маскіроўку».

Я са спадзяваннем падбег да Пятровіча. «Васіль і Надзея, непрыкметна з падветранага боку падбярыцеся да ручая, разведайце, што там ды як, — прашаптаў выкладчык. — Мне здаецца, там кампанія людзей, і, можа быць, гэта нямецкія парашутысты. Чаму менавіта вы? Ты, Васіль, добра арыентуешся ў лесе, Надзея лепш за ўсіх ведае нямецкую мову. Вось чаму я вырашыў паслаць у разведку менавіта вас... Будзьце асцярожныя. Вас надзейна прыкрыюць галіны багуну. Да таго ж вы абодва невялікага росту. Нідзе без прычыны не высоўвайцеся!»

Антон Пятровіч перадаў нам свой бінокль і папрасіў добра абследаваць узгорак. Там маглі быць дыверсанты, якія парупіліся б пра баявую ахову. Асцярожна, стараючыся не наступаць на сухое галлё, мы прайшлі 50 метраў, потым ляглі на зямлю і папаўзлі па-пластунску, хаваючыся ў зарасніку багуну і дурніц.

«Вася, пачакай хвілінку, — прамовіла Надзея, прыставіўшы да вачэй бінокль. — Бачыш, на горцы велізарны дуб, якому больш за стагоддзе?»

«Канешне, бачу», — адказаў я.

«Дык вось, там у густой кроне на тоўстай галінцы сядзіць чалавек з ручным кулямётам Дзегцярова, — прамовіла дзяўчына. — А цяпер хутка паўзём у бок высокіх махнатых елак і запаўзаем пад іх густую крону».



Васіль Міхайлавіч МАСКАЛЬЧУК *(у верхнім шэрагу крайні справа)* са сваімі баявымі сябрамі з 10-й асобнай гвардзейскай танкавай брыгады. Фота зроблена на тэрыторыі Літвы адразу пасля Перамогі.

Праз пару хвілін нас ужо схавалі густыя калючыя галіны старой елкі, якія апускаліся да самай зямлі. Адсюль добра быў відаць той самы Блакітны ручай. Каля яго мы ўбачылі вялікую групу людзей у новай чырвонаармейскай форме з вінтоўкамі ў руках. Пасярэдзіне гэтай групы стаяў чалавек у форме маёра Чырвонай Арміі. Ён разглядваў карту і штосьці казаў іншаму афіцэру рангам ніжэй, які стаяў побач. Яны размаўлялі па-нямецку.

«Пра што яны гавораць?» — спытаў я ўсхваляваную дзяўчыну.

«Па-мойму, яны кажуць пра нейкі ўмоўны код «Дортмунд». І яшчэ яны збіраюцца рухацца ў бок нашага вучылішча», — шэптам прамовіла дзяўчына.

Праз 20 хвілін, хвалюючыся і перабіваючы адно аднаго, мы дакладвалі Пятровічу пра тое, што ўбачылі і пачулі. Выслухаўшы наш аповед, Антон Пятровіч сказаў задуменна: «Вы малайцы. Як я і меркаваў, гэта дасведчаныя нямецкія дыверсанты, закінутыя нам у глыбокі тыл. Але пакуль усё ціха. Нечага яны чакаюць, але чаго? Хутчэй за ўсё, яны з абвера, якім кіруе Канарыс, ці легіёна Скарцэні. А гэта дасведчаныя таварышы, яны ў сябе дурняў не трымаюць. І што за «Дортмунд»? Усё гэта цьмяна».

Антон Пятровіч прыняў рашэнне тут жа: «А зараз, Васіль і Надзея, бяжыце хутчэй прамой дарогай у Пасталы і неадкладна перадайце дырэктару вучылішча, каб ён тэрмінова патэлефанаваў у Жыткавічы ў пагранічную заставу. Няхай па трывозе падымаюць асабовы склад і адпраўляюць сюды. Я думаю, дыверсанты хутка тут з'явяцца. Ім трэба разведаць абстаноўку, а тое, што вайскоўцаў у пасёлку няма, пэўна, яны ведаюць. Нікому не кажыце пра гэта, акрамя дырэктара. Магчыма, у вучылішчы ёсць ворагасведамляльнік. Толькі ідзіце асцярожна і майце на ўвазе, што там можа быць двайная ахова. Вас не пашкадуюць, калі заўважаць. А я павяду групу іншай дарогай у пасёлак, кругамі».

Ужо праз паўтары гадзіны мы з Надзеяй рабілі даклад дырэктару вучылішча аб здарэнні ў лесе. Дырэктар неадкладна патэлефанаваў у Жыткавічы на заставу пагранічнікаў. Узброены атрад зараз жа выехаў на спецыяльным цягніку на станцыю Старушкі. Да Пасталоў дабраліся вузкакалейкай.

За два кіламетры да пасёлка атрад выгрузіўся. На меркаваных напрамках руху дыверсантаў былі зроблены засады. Але пасля вырашылі ўсё ж захапіць немцаў у Пасталах: у лясным баі хтосьці мог і схавацца, а гэтага дапусціць было нельга.

Тут трэба зрабіць адну заўвагу. Дзяржаўная граніца СССР да 1939 года праходзіла побач з Жыткавічамі. Нягледзячы на ўз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі, застава там захоўвалася і надалей — былі на тое важкія прычыны. Гэтая акалічнасць і адыграла ключавую ролю ў нашым аповедзе.

...Вучылішча жыло сваім звычайным жыццём. Не было ніякай панікі. Захоўвалася строгая сакрэтнасць. Змены закранулі толькі сталоўку. Разам з кухарамі завіхаліся пераадзетыя чэкісты. У апошніх пад белымі халатамі была схавана зброя. Каля раздатачнага акна замаскіравалі кулямёт Дзегцярова. Да прыёму «дарагіх» гасцей было гатова ўсё. Заставалася толькі пачакаць.

Калі пачало вечарэць, у пасёлак увайшоў вялікі атрад «чырвонаармейцаў». Самы высокі нёс на плячы кулямёт Дзегцярова, астатнія былі ўзброены вінтоўкамі. Наперадзе калоны ішлі маёр з лейтэнантам, якіх бачылі мы з Надзеяй.

Дырэктар нашага вучылішча з пашанай пакланіўся высокаму начальству. Запрасіў на вячэру, прапанаваў схадзіць у лазню, змяніць бялізну... Да размовы падключыўся наш выхавацель Антон Пятровіч. Ён прапанаваў пасля лазні пераначаваць. І сказаў, што чыстыя пасцелі дарагім абаронцам радзімы зараз падрыхтуюць.

Дакументы ў гасцей не правяралі ў мэтах канспірацыі, каб не выклікаць падазрэнняў. Добра памятаю, што размаўлялі толькі маёр з лейтэнантам. Іншыя насцярожана маўчалі, ніякіх эмоцый на іх тварах прачытаць было нельга.

Яны пагадзіліся павячэраць, але толькі са зброяй. На вуліцы, каля дзвярэй, паставілі вартавога. Праз пару хвілін яго без шуму «знялі» пагранічнікі, якія заселі ў кустах. «Чырвонаармейцы» не спяшаючыся расселіся па сталах, паставілі каля сябе вінтоўкі, пачалі есці.

І неўзабаве прагучала рэзкая каманда: «Усім устаць, рукі ўгору! У выпадку супраціву страляем без папярэджання!» Усе новыя «кухары» выхапілі наганы і пісталеты, а з раздатачнага акна на гасцей пагрозліва глядзела дула кулямёта.

...Дыверсанты выходзілі са сталоўкі з узнятымі рукамі. З лесу тым часам падцягнуліся пагранічнікі і міліцыя, якія акружылі «чырвонаармейцаў» шчыльным колам і пачалі правяраць дакументы. Як і чакалася, яны былі ў ідэальным парадку. Аднак тут было адно «але», пра якое даўно ведала наша разведка, а інфармацыяй ад яе карысталіся і чэкісты, і пагранічнікі. Справа ў тым, што аркушыкі нашых дакументаў прашываліся ніткамі, а абвераўцы чамусьці карысталіся тонкім стальным дротам — магчыма, з-за яго большай трываласці. І вось у нашых «чырвонаармейцаў» усе дакументы якраз былі знітаваны дротам.

Па слядах дыверсантаў пусцілі службовага сабаку, які неўзабаве знайшоў у лесе замаскіраваны схрон. Там было нямецкае абмундзіраванне на кожнага «чырвонаармейца», форма обер-лейтэнанта і форма оберштурмфюрара. Былі там парашуты, аўтаматы, парабелумы, гранаты, бікфордавы шнуры і вельмі шмат выбухоўкі, дакументы, халодная зброя, харчаванне, радыёстанцыя.

Раніцай дыверсантаў адправілі ў Калінкавічы пад узмоцненай аховай.

...А праз паўтара тыдня пачалася вайна. Я спачатку партызаніў у 130-й брыгадзе Палескага злучэння, а пасля вызвалення ваяваў у складзе 1-га Прыбалтыйскага фронту ў 10-й гвардзейскай Гарадоцкай танкавай брыгадзе.

Надзея была ў нашай жа брыгадзе, толькі ў іншым атрадзе. Яна засталася жывая. Як склаўся лёс Антона Пятровіча — невядома.

І толькі праз шмат гадоў, калі пасля вайны былі рассакрэчаны многія дакументы, стала вядома, што ж азначаў той умоўны сігнал «Дортмунд». Ён паступіў у генштаб нямецкай арміі 20 чэрвеня 1941 года. Праз суткі — ва ўсе нямецкія злучэнні наступальнай групіроўкі праціўніка. Гэта быў сігнал нападу на Савецкі Саюз.

І тады стала ясна, чаго ж чакалі ў сасонніку каля нашага вучылішча нямецкія дыверсанты. Да сігналу «Дортмунд» ім было забаронена праводзіць дыверсіі, бо тэрміны нападу на СССР не раз пераносіліся. А вось калі сігнал быў дадзены, то дыверсанты, закінутыя з самалётаў у тыл напярэдадні вайны, пачалі ўзрываць масты, забіваць камандзіраў, распаўсюджваць паніку ў войсках, паказваць цэлі нямецкім самалётам. Як правіла, усе дыверсанты былі ў форме Чырвонай Арміі і з падробленымі дакументамі, добра размаўлялі па-руску.

...Я расказаў чытачам нязначны эпізод вайны, якая тады яшчэ не пачалася. Але нават ён унёс сваю лепту ў нашу Перамогу. Бо не ўзарвалі мост, засталіся жывымі камандзіры, было менш панікі, захаваліся самалёты на аэрадроме. І ўсё гэта дзякуючы нам, курсантам вучылішча, а таксама дырэктару і выхавацелю Антону Пятровічу...

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Лови призы в Виталюр!» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Карта «Виталюр»** – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты лояльности «Виталюр» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером «Виталюр» (далее – Номер карты «Виталюр»), эмитированной ОДО «Виталюр», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

**Карта «Моцная картка»** – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты «Моцная картка» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером (далее – номер карты «Моцная картка») и зарегистрированной в системе Программы лояльности ОДО «Виталюр», эмитированной ОАО «Белинвестбанк», ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ЗАО «Идея-Банк», ОАО «Банк БелВЭБ», ЗАО «Альфа-Банк», ЗАО «БСБ Банк», ОАО «Технобанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ЗАО «РРБ-Банк», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

**Персональные данные** – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) на интернет-сайте www.vitalur.by, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии);
- адрес пребывания/проживания в Республике Беларусь: населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно, при наличии), корпус (обязательно, при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона Участника в сети белорусского оператора сотовой связи в международном формате (обязательно).

**Интернет-сайт** – www.vitalur.by

**1. Организатором рекламной игры** является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Электронный адрес: info_igra@mail.ru

**2. Наименование рекламной игры:** «Лови призы в Виталюр!».

**3. Территория проведения игры**: магазины «Виталюр» на территории Республики Беларусь (далее – магазины «Виталюр»).

**4. Срок начала и окончания рекламной игры,** включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 29 апреля 2020 года по 17 июля 2020 года.

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

Председатель комиссии:

Кривоногова Надежда Александровна – ведущий специалист по работе с клиентами ООО «ЭфСиБи Бел»;

Члены комиссии:

Одинец Евгений Юрьевич – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Бакач Татьяна Николаевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Терентьева Анастасия Юрьевна – ведущий специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Корпик Екатерина Игоревна – специалист по рекламе ООО «ПРОСПЕКТПРЕСС»;

Кубицкий Борис Дмитриевич – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Оралина Кристина Андреевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел».

— Гэта адбываецца само сабой. Некаторыя казкі я помню яшчэ з глыбокага дзяцінства, калі нават чытаць не ўмеў. Мая маці працавала прыбіральшчыцай у школе і прыносіла кнігі са школьнай бібліятэкі. Відаць, яны паўплывалі на маю фантазію. Мне запомніліся казкі братоў Грым з ілюстрацыямі Гюстава Дарэ: калі ў мяне пытаюцца, чаму малюю такіх пачвар, я раю паглядзець ілюстрацыі да еўрапейскіх казак, а там усё сур'ёзна, напужацца ж дзіцяці таксама цікава. Мне кажуць, што ўсе гэтыя вобразы мне, напэўна, сняцца, але я з імі ўжо даўно на «ты», яны мяне ўвогуле не пужаюць, я добра арыентуюся ў гэтым уяўным свеце, і прыдумляць мне нічога не трэба. Персанажаў, якіх не магу ўявіць, я проста не малюю.

***— Ці ёсць такія кнігі, якія немагчыма праілюстраваць?***

— У цэлым магчыма ўсё, але не заўсёды трэба. Як можна праілюстраваць таго ж «Уліса» Джойса? Некаторыя кнігі першапачаткова не разлічаны на ўзнікненне візуальнага раду, іх нельга намаляваць альбо экранізаваць — толькі прачытаць, альбо ты схлусіш. У 2008 годзе выйшла кніга «Чароўны свет» — я зрабіў каля васьмідзесяці ілюстрацый, але адмаўляўся пісаць банальныя вобразы і тыя, якія не магу ўявіць. Экзархат, дарэчы, быў ёй незадаволены — у выдавецтва прыйшлі лісты, дзе яго абвінавачвалі ў рэкламе чартаўшчыны. Пашанцавала, што кніга тады ўзяла дыпломы на маскоўскім конкурсе, інакш невядома, што б з ёй было. Усё ж у свецкія справы царква не павінна ўмешвацца, тым больш я не сам усё гэта прыдумляў, а выкарыстоўваў народныя вобразы.

***— Вы добра арыентуецеся ў беларускім і замежным фальклоры — у чым вам бачыцца ўнікальнасць беларускага?***

— Чаму мне і цікава з ім працаваць, бо ў нас шмат персанажаў, якіх больш нідзе не сустрэнеш. Напрыклад, у нас шэсць відаў русалак, і не толькі прывабных тапельніц, але і страшных пачвар. Ёсць напалову змяіныя русалкі, ёсць палявыя і лясныя, а ёсць тыя, што на зіму абрастаюць белым футрам. І гэта не столькі фантастычная прыдумка — у мяне ёсць уражанне, што гэтыя істоты былі падгледжаны ў нейкім вымярэнні, бо прыдумаць некаторыя рэчы, здаецца, проста немагчыма. Ёсць у нас, напрыклад, дзікія людзі з адным вокам, якія не працуюць, ляжаць пад дрэвамі і з трубачкамі нападаюць на людзей, каб высмактаць іх кроў, — даволі нечаканая асацыяцыя з жыхарамі Афрыкі. Ёсць Мара, якая садзіцца і цісне чалавеку на грудзі, пакуль ён спіць, — яна нябачная, але калі рэзка прачнуцца, можна ўбачыць на сабе дзіўную пачвару. Некаторыя вобразы, вядома, пераклікаюцца з персанажамі іншых фальклораў, тут граніц не бывае, гэта людзей можна пасадзіць у межы.

***— Ці ёсць у Беларусі кніжная графіка як з'ява, альбо гаворка ідзе пра асобных дзеячаў і асобныя выданні?***

— У любым выпадку яна не зачахла. Я ж у журы прэміі Цёткі для дзіцячых пісьменнікаў і ілюстратараў — у гэтым і мінулым гадах было прадстаўлена даволі шмат намінантаў.

***— Як часта беларускія выдаўцы запрашаюць мастакоў да супрацы?***

— Вельмі часта яны займаюцца перавыданнем, а канешне, хацелася б, каб выдавецтвы больш займаліся з беларускімі мастакамі. Усё гэта неяк непрадумана, няўстойліва, зыбка. Нават дзяржаўныя выдавецтвы не часта запрашаюць маладых ілюстратараў — стараюцца нешта рабіць сваім калектывам. Ёсць праблема і з аплатай: не хочуць плаціць мастаку, не ведаю чаму, гэта балючае пытанне, праз гэта церпіць уласна кніжная графіка. Раней ты здаваў работу і атрымліваў грошы, нават аванс маглі даць, усё астатняе — выдавецкая рызыка. Цяпер выдаўцы не хочуць рызыкаваць і плацяць мастаку толькі пасля таго, як прадаўся нейкі працэнт накладу. Я магу дазволіць сабе згадзіцца працаваць на такіх умовах, калі мне падабаецца задача, а моладзь першым чынам пытаецца пра ганарар, і правільна робіць. Я ілюстраваў пару кніжак у Маскве — мне заплацілі адразу. У Маскве і Пецярбургу шмат графікаў, але выдавецтвы, бывае, запрашаюць беларускіх мастакоў, бо з намі можна дамовіцца на меншыя сумы. А калі ў нас не плацяць, а там плацяць адразу, найлепшыя беларускія графікі займаюцца чужымі праектамі. Трэба ўсё ж плаціць за працу і ствараць канкурэнцыю, каб выбіраць мастакоў, а не браць першых, хто згадзіўся. У маркетынгавых аддзелах выдавецтваў павінны быць спрытныя людзі, а там сядзяць цёткі, якія кажуць, маўляў, як мы можам вам заплаціць, калі мы і самі заробкі кнігамі атрымліваем. Я тады кажу: давайце, так і працягвайце. У свеце добра арганізаваная выдавецкая справа вельмі прыбытковая, але звычайна людзі стараюцца рухацца.

***— А вы можаце ўзяцца за работу, якая вам не вельмі цікавая, але за яе прапануюць добры ганарар?***

— У свой час даводзілася, цяпер я такіх рэчаў пазбягаю. Калі не вельмі хочацца працаваць, яно і не атрымліваецца, работы будуць прахадныя, нават калі сама кніга захапляльная. Не было гарантыі, што і мае ілюстрацыі да «Ведзьмара» атрымаюцца, таму што было шмат матэрыялу і ўзнікалі пэўныя сумненні. Але добра, што гэтая кніга выйшла, — даўно ў нас беларускіх казак не выдавалі. Брыль сказаў, што ў яго яшчэ шмат матэрыялу.

***— Ці бывала, што нехта прасіў вас паправіць ілюстрацыі?***

— Бывала, і я папраўляў, але не моцна і толькі калі сам лічыў, што гэта варта зрабіць. А калі мяне папракалі, напрыклад, у тым, што на маім малюнку вупыр сядзіць у труне, маўляў, навошта такое рабіць, я казаў: «Дык пачытайце тэкст, які вы мне далі, там гэта ёсць».

***— Вы сталі ўсё больш адмаўляцца ад прапаноў па стварэнні ілюстрацый. Чаму?***

— Я дастаткова зрабіў для беларускай кніжнай графікі і хачу заняцца сваімі задумкамі, напрыклад, афортамі і вялікімі пяровымі малюнкамі. У мяне цяпер найлепшы перыяд жыцця — я сам сабе гаспадар, ніхто мяне не ганяе і нічога не патрабуе. Калі я пачынаў, займаўся тым, што давалі ў выдавецтве, — пісаў, памятаю, пра піянераў, якія збіраюць металалом, і браў тое, што ніхто іншы браць не хацеў. Цяпер жа бяруся за тую працу, за якую хачу, і ў мяне шмат задумак па сваіх уласных графічных работах. Можа, гэта і эгаізм, але ж яны ў любым выпадку пасля мяне застануцца. Бывае, калі мастак сыходзіць з жыцця, яго творчасць пачынае карыстацца попытам. А бывае наадварот — пры жыцці ён атрымлівае прэміі, а памёр і — аказаўся нікому не патрэбны, нашы музеі такімі забітыя. Прычым гэта абсалютна непрадказальна, тут ёсць нейкі містыцызм: як Ван Гог, у якога пры жыцці купілі адзіную работу, і тое пакупніком быў брат, мог спадзявацца на такую пасмяротную славу? Альбо Бацічэлі, якога трыста гадоў не ўспаміналі, а «Нараджэнне Венеры» ў рэшце рэшт стала культавай работай?

***— А вашы творы, як думаеце, застануцца?***

— Кожны мастак спадзяецца, што так, што ён робіць нешта значнае. Калі ў цябе няма славалюбнай ноткі, няма чаго займацца мастацтвам, бо ты нічога не даб'ешся. Оскар Уайльд добра пра гэта сказаў: «Мастак без прагі да славы — тое ж самае, што жанчына без прагі падабацца: абодва нудныя».

***— Вы выкладаеце ў Акадэміі — ці шмат сёння ахвотных працаваць у кніжнай графіцы?***

— Не сказаць, каб шмат. Менш за палову студэнтаў кафедры графікі, гэтым разам у мяне толькі дзве дыпломніцы працуюць з літаратурай: адна робіць станкавыя лісты па матывах японскіх паданняў, а другая — гравюры на паэзію Шарля Бадлера. Ніхто не хоча нічога беларускага рабіць. Мы раней усё ж улічвалі, дзе мы і хто мы, а цяпер студэнты бяруць нешта на іх погляд арыгінальнае, хоць сапраўдную арыгінальнасць можна праявіць, калі незвычайна праілюстраваць тое, што ўжо праілюстравана.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Арт

# МАСТАКІ ВЫХОДЗЯЦЬ З ЦЕНЮ

**Новы час дыктуе новыя падыходы: арганізатары мастацкіх імпрэз імкліва вучацца праводзіць іх з улікам абмежаванняў дыстанцыяй і самаізаляцыяй. Так, штогадовы культурны праект «Мастак і горад», які прысвечаны сёлета 100-годдзю творчай суполкі УНОВІС, у сярэдзіне мая дзявяты раз адкрыецца на сталічнай плошчы Якуба Коласа — але ўпершыню ў анлайн-фармаце.**




На працягу васьмі мінулых гадоў «Мастак і горад» выводзіў карціны за межы галерэй, музеяў і прыватных калекцый — з вузкага кола знаўцаў і прыхільнікаў у публічную гарадскую прастору, прычым не толькі мінскую — выстаўка праходзіла таксама ў Віцебску і Брэсце, расквечваючы будзённасць вуліц і адкрываючы, куды ўжо бліжэй, для шырокай публікі творчасць класікаў і сучаснікаў беларускага выяўленчага мастацтва — Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Валянціна Губарава, Георгія Скрыпнічэнкі, Мікалая Селешчука, а летась — Зоі Луцэвіч і Зоі Літвінавай. Цяперашні пераход у анлайн-рэжым, як мяркуюць арганізатары, дазволіць шматразова павялічыць аўдыторыю і пайсці яшчэ далей — з гарадскіх вуліц і плошчаў наўпрост у кватэры ўсіх аматараў жывапісу, незалежна ад іх месцазнаходжання.

У гэтым сезоне выставачны праект, падтрыманы гарадскімі ўладамі Мінска і Віцебска, ладзіцца пад знакам #UNOVIS100 і прадставіць гледачам 32 работы айчынных мастакоў-авангардыстаў. Сярод аўтараў — жывапісцы з віцебскага мастацкага аб'яднання «Квадрат» Аляксандр Малей, Мікалай Дундзін, Віктар Шылко, Аляксандр Слепаў, Валерый Чукін і Аляксандр Дасужаў. «Квадрат» дзейнічаў у Віцебску ў 1987—1994 гадах і, паводле ўласнага азначэння, «прэтэндаваў на самастойнасць і незалежнасць у дачыненні да творчасці і арганізацыі творчага працэсу», пры гэтым развіваў ідэі і асноўныя прынцыпы супрэматызму Казіміра Малевіча, а таму з поўным правам мог звацца спадчыннікам УНОВІСа.

Дырэктар Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва Андрэй Духоўнікаў адносіць праект «Мастак і горад» да тых падзей, што не бяруцца з ніадкуль, а нібыта выходзяць з ценю:

— Нягледзячы на модныя і нямодныя плыні, змены кан'юнктур, з'яўленне і сыход новых рэалій, у Віцебску быў і ёсць свой, шмат у чым унікальны, культурны асяродак. У ім нараджаліся і працягваюць нараджацца новыя ідэі, новыя мастакі. Можна гаварыць пра сувязь з самымі вялікімі імёнамі, праводзіць паралелі, але віцебскія мастакі, такія, якія яны ёсць, — яркія індывідуальнасці, асобы. У іх творчасці гучыць Віцебск, горад, людзі і тыя вібрацыі, што можна адчуць, паглядзеўшы работы, прадстаўленыя на выстаўцы».

Зрабіць гэта сёлета будзе як ніколі проста: «Мастак і горад» пераходзіць у анлайн-рэальнасць. Каб наведаць экспазіцыю, не трэба нават пакідаць кватэру — з 14 мая віртуальны тур па плошчы Якуба Коласа можна зладзіць на сайце праекта higminsk.by. На інтэрнэт-лакацыі ў панарамным фармаце будуць размешчаны белыя кубы з рэпрадукцыямі карцін. «Абыходзячы» канструкцыю, інтэрнэт-наведвальнікі змогуць разгледзець кожную работу з усіх бакоў, а пры націсканні на рэпрадукцыю адкрыецца фотаздымак высокай якасці. Карціны традыцыйна суправаджаюцца апісаннямі на беларускай, рускай і англійскай мовах.

У звыклым фармаце, на сапраўднай, а не віртуальнай плошчы праект «Мастак і горад» 2020 года плануецца адкрыць, як толькі гэта дазволіць зрабіць эпідэміялагічная сітуацыя. Калі ўсё атрымаецца, экспазіцыя таксама прыедзе з Мінска ў Віцебск, дзе сто гадоў таму і нарадзілася творчае аб'яднанне УНОВІС.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота арганізатараў праекта.**

Падзея

# Творцы прадалі сваіх работ на 37 тысяч рублёў, каб дапамагчы медыкам

**Падтрымкай беларускім медыкам у час распаўсюджвання каранавіруса стала дзейнасць мастакоў — з 15 да 22 красавіка на адмысловым анлайн-аўкцыёне «Дзякуй!» кожны ахвотны мог набыць адзін са ста выстаўленых на продаж твораў і такім чынам адправіць грошы на сродкі індывідуальнай аховы, абсталяванне і паўнавартаснае харчаванне для медыцынскіх работнікаў.**

«91-ы» Аляксандра Бельскага.



Гэта была ініцыятыва вядомага мастака Руслана Вашкевіча і арт-ідэолага Аліны Саўчанка. Паводле ідэі, беларускія мастакі бязвыплатна прадставілі свае работы да ўдзелу ў аўкцыёне, які тым часам сабраў творы на любы густ ва ўсіх тэхніках — жывапіс, графіку, фатаграфію, скульптуру, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. А таксама на любы кашалёк — стартавыя цэны вар'іраваліся ад 10 да 5000 рублёў.

У праекце паўдзельнічалі каля ста аўтараў, сярод якіх сам Руслан Вашкевіч, а таксама Алег Ладзісаў, Жанна Капуснікава, Андрэй Басалыга, Леся Пчолка, Сяргей Балянок ды іншыя.

Дабрачынны аўкцыён прайшоў на пляцоўцы «Куфар» і ў выніку сабраў 37 тысяч рублёў, частка з якіх ужо адпраўлена на рахункі дабрачынных ініцыятыў. Паведамляецца, што найбольш выгадна арганізатары прадалі твор уласна ініцыятара аўкцыёна Руслана Вашкевіча — за «Мадам Банжур» пакупнік прапанаваў 2500 рублёў. З іншых поспехаў — стартавая цана работы «91-ы» Аляксандра Бельскага павялічылася ў шэсць разоў.

Новыя ўладальнікі выстаўленых твораў да заўтрашняга дня працягваюць адрасна пералічваць грошы на прызначаныя ў дапамогу медыкам праекты, размешчаныя на фандрайзінгавай платформе MolaMola.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

## Информация о деятельности ОАО «Гранд Фэшен Хаус», УНП 290671335, г. Брест, ул. Куйбышева, 13-40, по состоянию на 31.12.2019 г.

Доля государства в уставном фонде ОАО «Гранд Фэшен Хаус» – 0 %.

Количество акционеров – всего 45. В том числе: юридических лиц – 7, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физических лиц – 38, из них нерезидентов Республики Беларусь – 2.

Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателей | Единицы измерения | за 2019 год | за 2018 год |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | рублей | 0 | 0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 16,70 | 13,53 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

| Наименование показателя | Единица измерения | за 2019 год | за 2018 год |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 1946 | 1692 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 942 | 901 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 849 | 398 |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 1004 | 791 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -40 | -108 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -115 | -285 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 158 | 72 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 691 | 326 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 1595 | 902 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 920 | 1257 |

Среднесписочная численность работающих – 39 человек.

Основные виды деятельности – сдача внаем собственного недвижимого имущества – 1946 тыс. рублей (100 %).

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2019 г.: 25 марта 2020 года.

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности за период с 01.01.2019 г. по 31.12.2019 г. подготовлено 13 марта 2020 г. ИП Балабан А.В., ул. Жукова, 15А, кв. 4, г. Брест, РБ, регистрационный номер № 200689434. По мнению аудитора, бухгалтерская отчетность Открытого акционерного общества «Гранд Фэшен Хаус» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 01 января 2020 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2019 год. Аудиторское заключение опубликовано полностью 23.04.2020 г. на сайте ЕПФР. Правила корпоративного поведения применяются. Регламент работы ОАО «Гранд Фэшен Хаус» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден решением Совета директоров 14.06.2019 г.

Положение о порядке ведения учета аффилированных лиц Общества утверждено решением совета директоров 14.06.2019 г.

Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет: **www.gfh.by**

Директор Д.В. Нижник

Главный бухгалтер И.Ю. Аксёнчик

## Информация о деятельности ОАО «Фирма «Элма» УНП 200295587, г. Брест, ул. Куйбышева, 13, по состоянию на 31.12.2019 г.

Доля государства в уставном фонде ОАО «Фирма «Элма» – 0 %.

Количество акционеров – всего 923. В том числе: юридических лиц – 5, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физических лиц – 918, из них нерезидентов Республики Беларусь – 5.

Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателей | Единицы измерения | за 2019 год | за 2018 год |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | рублей | 0 | 0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 5,43 | 5,41 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

| Наименование показателя | Единица измерения | за 2019 год | за 2018 год |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 2 977 | 2 679 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 2 961 | 2 683 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 4 | -213 |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 16 | -4 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | 4 | 5 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -16 | -214 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 4 | -213 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 401 | 397 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 900 | 762 |

Среднесписочная численность работающих – 115 человек.

Основные виды деятельности – производство прочей вязанной и трикотажной одежды – 2 977 тыс. рублей (100 %). Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2019 г.: 25 марта 2020 года.

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности за период с 01.01.2019 г. по 31.12.2019 г. подготовлено 06 марта 2020 г. ИП Балабан А.В., ул. Жукова, 15А кв. 4, г. Брест, РБ, регистрационный номер № 200689434. По мнению аудитора, бухгалтерская отчетность Открытого акционерного общества «Брестская трикотажная фирма «Элма» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 01 января 2020 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2019 год. Аудиторское заключение опубликовано полностью 23.04.2020 г. на сайте ЕПФР. Правила корпоративного поведения применяются. Регламент работы ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма» с реестром владельцев ценных бумаг утвержден решением Совета директор 14.06.2019 г. Положение о порядке ведения учета аффилированных лиц Общества утверждено решением совета директоров 14.06.2019 г. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет: **www.elma.by**

Управляющий С.В. Тарасов

Главный бухгалтер Т.С. Захарова

## Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 31.12.2019

Организация:

**ОАО «Лукомльэнергомонтаж»**

| | |
|---|---|
| Учетный номер плательщика | 300007839 |
| Вид экономической деятельности | Строительно-монтажные работы |
| Организационно-правовая форма | Собственность негосударственных юридических лиц |
| Орган управления | Без ведомственной подчиненности |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 211162, Витебская обл., г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8 |
| Дата утверждения: 17.04.2020 г. Дата отправки: 22.04.2020 г. | |

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2019 года

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2019 года | На 31 декабря 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 509 | 398 |
| Нематериальные активы | 120 | | 1 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2 | 2 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **511** | **401** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 516 | 451 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 368 | 296 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | |
| незавершенное производство | 213 | 130 | 131 |
| готовая продукция и товары | 214 | 18 | 24 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 | |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 649 | 371 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 328 | 58 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 494** | **880** |
| **БАЛАНС** | **300** | **2 005** | **1 281** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2019 года | На 31 декабря 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 51 | 51 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | (9) | |
| Резервный капитал | 440 | 251 | 171 |
| Добавочный капитал | 450 | 453 | 453 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 310 | 12 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | - |
| Целевое финансирование | 480 | | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 056** | **687** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 100 | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 847 | 592 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 314 | 231 |
| по авансам полученным | 632 | 247 | 222 |
| по налогам и сборам | 633 | 119 | 70 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 40 | 17 |
| по оплате труда | 635 | 124 | 51 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 3 | 1 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 2 | 2 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **949** | **594** |
| **БАЛАНС** | **700** | **2 005** | **1 281** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2019 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2019 года | За январь–декабрь 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 5 275 | 2 206 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (4 157) | (1 851) |
| Валовая прибыль | 030 | 1 118 | 355 |
| Управленческие расходы | 040 | (402) | (299) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 716 | 56 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | | (7) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 716 | 49 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 16 | 2 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 11 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 4 | 2 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 1 | |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (194) | - |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (194) | |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (178) | 2 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 538 | 51 |
| Налог на прибыль | 160 | (97) | (9) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 441 | 42 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | (46) | (30) |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 395 | 12 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

### Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01 января 2020 г.

**4**. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) – 0.

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 66 | 83 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 65 | 83 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | рублей | 102,93 | 66,97 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 1824 | - |

**7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 5275,00 | 2206,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 4559,00 | 2150,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 538,00 | 51,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 716,00 | 56,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | | -7,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -178,00 | 2,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 97,00 | 9,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 441,00 | 42,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 310,00 | 12,00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | | |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | | |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 73 | 61 |

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **42210 Строительство трубопроводов** – **93 %.**

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс за отчетный год: **17 апреля 2020 г.**

**Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности: 28 февраля 2020 г.**

**Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:** Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит»; 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 89, к. 3, пом. 4.; зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 600506719 решением Мингорисполкома от 28.04.2000 г. № 465.

**Период, за который производился аудит:** 2019 г.

**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях:** по нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверна во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Лукомльэнергомонтаж» на 31.12.2019 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном** объеме 23.04.2020 г. ЕПФР.

11. **Дата и источник опубликования годового отчета эмитента открытого акционерного общества за отчетный год (только в составе годового отчета)**

| Дата опубликования | Место опубликования |
|---|---|
| 25.04.2020 г. | ЕПФР<br>Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Звязда» |

Директор П.В. Глазко

Главный бухгалтер А.В. Круподёр

# БЛІЖЭЙ ДА «СВЕТЛАЙ БУДУЧЫНІ»

## ХОД САБАКАМ

У Пятра Сцяпанавіча стрэслася бяда: раптоўна, нечакана памёрла жонка. Толькі ж пайшла на пенсію, здавалася б, жыць яшчэ доўга і жыццю радавацца, унукаў песціць, а тут — як гром сярод яснага дня: адказала сэрца.

Пётр Сцяпанавіч пэўны час хадзіў сам не свой, счарнеў, схуднеў, зусім пазбавіўся апетыту. Жылі яны з жонкай удваіх, дзеці — дачка з сынам — асобна. Неўзабаве ў дачкі старэйшая дзяўчына, Святланка, пабралася шлюбам з прыгожым хлопцам, з якім разам працавалі ў «Еўраопце», і дачка з мужам на сямейным савеце вырашылі пакінуць маладым сваю двухпакаёвую кватэру, а самім перабрацца да бацькі, да Пятра Сцяпанавіча, значыць, у такую ж. Апошняму сказалі прыкладна наступнае: табе з намі лягчэй будзе, дарагі наш чалавек, усё ж старасць — не радасць, там, можа, хуткую дапамогу выклікаць трэба будзе, а хто гэта зробіць, калі сам не зможаш, а так мы будзем заўсёды побач. Пад рукой. Ды і гатаваць самому ежу не трэба. А гэта, пагадзіся, вялікі плюс. Пра тое, што за кватэру будуць плаціць, ні слова. У бацькі, маўляў, пенсія неблагая, адзення хопіць да канца жыцця, паспеў бы панасіць хоць тое, што ёсць. Ну а калі падкупіць што-небудзь спатрэбіцца з дробязі, то бяды тае! А так куды яму яшчэ грошы дзяваць?



Пётр Сцяпанавіч і сам узрадаваўся, калі пачуў ад дачкі з зяцем такую прапанову. Параязджайце, жывіце. Месца хопіць. Я стары і вы немаладыя — як-небудзь паладзім.

Яны і жылі добра, паміж імі панаваў лад. Зяць ніколі не павышаў голаса на жонку, што асабліва радавала бацьку, уважлівы, абыходлівы быў з ім. Іншы раз прыносіў бутэльку гарэлкі, яны доўга сядзелі тады на кухні, бралі па кілішку і гаманілі пра жыццё-быццё.

А неяк зяць прынёс сабачку. Сказаў, знайшоў на двары. Нехта, няйначай, выкінуў. Пашкадаваў, падабраў, а тым, хто пазбавіўся ад шчанюка, выпісаў некалькі няласкавых слоў.

Шчанюк хутка рос, а разам з гэтым стварыў нямала і праблем. Сваімі вострымі кіпцюрамі папсаваў шпалеры ў пярэдняй, пагрыз тое-сёе з мэблі. Не ведалі, куды хаваць ад яго абутак. А там і не заўважылі, як сабака стаў вялікі — якраз такі, як Мухтар, што ледзьве не кожны дзень ловіць на тэлеэкране парушальнікаў законнасці.

— Тата, — сказала, сарамліва хаваючы вочы, аднойчы дачка, — ты ж бачыш, колькі праблем стварыў нам сабака. Можа, ты з ім пераехаў бы на дачу, як думаеш? Дом у нас там добры. Дровы ёсць. Тэлевізар возьмеш са свайго пакоя. А мы цябе праведваць будзем...

...Пётр Сцяпанавіч ужо некалькі гадоў жыве на дачы. У горад раней прыязджаў па пенсію, пэўную суму грошай ашчаджаў дачцэ і зяцю. А пазней, калі даведаўся ад добрых людзей, што «ціхі і добры зяць» наўмысна раздабыў недзе шчанюка, каб з цягам часу і зрабіць гэты «ход сабакам», выкурыць старога з гарадской кватэры, тады ўзяў у ашчадным банку картку. Прадукты харчавання можна купіць па ёй і ў суседняй вёсцы. Вёска блізка, а выбар у краме там багаты, гораду не саступае. Ды і за кватэру няхай самі плацяць. Не будуць такімі разумнікамі!

Стары збіраўся сказаць пры зручным выпадку зяцю, які ён нягоднік, а потым суцешыў сябе: а мне тут, на дачы, можа, яшчэ і лепш. Бяды той! Ён гладзіў сабаку, казаў яму добрыя словы і колькі не шкадаваў, што той з'явіўся ў яго жыцці...

## ПРАДБАЧЛІВАСЦЬ

На мінулым тыдні да Зоі Пятроўны заглянуў старэйшы сын Юрка, сказаў: быў у бацькі ў бальніцы, адвёз яму што той прасіў, таму не хвалюйся за яго — няхай спакойна папраўляе здароўе. Заадно пахваліўся: набыў новую пральную машыну і не можа нарадавацца. Як толькі сын прычыніў за сабой дзверы, старая падышла да сваёй пральнай машыны, закінула бялізну, уключыла... І толькі цяпер заўважыла, што яна быццам не так працуе — падоўгу маўчыць, а калі пачынае выконваць чарговую аперацыю, то робіць гэта неяк неахвотна, марудна.

Назаўтра яна патэлефанавала сыну: прыедзь, паглядзі, што зрабілася з маёй «сціралкай». Сын прыехаў. Разабраўся, нічога такога не знайшоў. «Ды ўсё нармальна, мама! Дарэмна хвалюешся. На ваш век з бацькам яе хопіць...» І паехаў. Але тое, што машыне ўжо дзесяць гадоў, не давала старой спакою. «Бач ты яго, Юрку! Сваю памяняў, нібыта выпрацавала рэсурс, а нам, бацькам, і так добра будзе. Не атрымаецца!»

Як толькі выпісалі з бальніцы Рыгора Сцяпанавіча, яна пацягнула яго ў краму, што побач з іх домам і дзе тых пральных машын — вочы разбягаюцца. І хоць стары ўпарціўся, як і сын, неўзабаве новая пральная машына стаяла ў ванным пакоі. Зоя Пятроўна не магла нарадавацца. Суседкам жа хвалілася:

— Рыгорка ж мой слабенькі, баюся, адна застануся. Дык пакуль дзве пенсіі атрымліваем, рашылі памяняць «сціралку». Бо калі адна застануся, як зраблю гэта? А новая ж машынка яшчэ і пасля мяне паслужыць людзям. Тая, старая, у любы момант магла аддаць канцы, і я б засталася каля разбітага карыта... А цяпер я спакойная... Хоць хто яго ведае, можа, мой Рыгорка яшчэ і мяне перажыве... Хай жыве... Хіба ж я супраць?.. Аднак тыл павінен быць забяспечаны...

## ХІТРАСЦЬ

Валянціна Адамаўна вырасла ў вёсцы. Сям'я ў іх была вялікая па сённяшніх мерках — ажно пяцёра дзяцей: тры хлопцы і дзве дзяўчынкі. Бацькі працавалі ў калгасе. Маці — даяркай, а бацька перабраў шмат вясковых спецыяльнасцяў. І за плугам хадзіў, і ў будаўнічай брыгадзе быў не апошнім чалавекам, а калі ўжо пастарэў, то стаяў на калгасных вагах. Ён так і адказваў цікаўным на пытанне, чым займаецца сёння: «Стаю на вагах!» І вымаўляў гэта з нейкім асаблівым непрыхаваным гонарам. Мо таму, што праца была лёгкая і яе атрымаць многія жадалі б, а, бач ты, пашэнціла яму.

Сёння старых няма ўжо на гэтым свеце, а бацькоўскае гняздо, вядома ж, апусцела: з дзяцей ніхто не застаўся ў вёсцы. У гарадах, вялікіх і маленькіх, уладкаваліся яны ўдала, маюць добрыя прафесіі і дружныя сем'і. Сама ж Валянціна Адамаўна жыве ў раённым гарадку, тут працуе на заводзе і адзіная яе дачка. Скончыла ў свой час інстытут, займае добрую пасаду і вельмі часта ездзіць у камандзіроўкі ў Маскву. А ў Белакаменнай яшчэ з савецкага часу трывала абсталяваўся старэйшы брат Валянціны Адамаўны — Генадзь. Ён чалавек адукаваны, мае вышэйшую адукацыю і, хоць атрымлівае пенсію, яшчэ працуе. Сястра ганарылася братам: значыць, спецыяліст добры, калі трымаюць у калектыве нават у такім сталым узросце. Некалькі разоў дачка Валянціны Адамаўны, калі той надаралася камандзіроўка ў Маскву, сустракалася з дзядзькам. Той страчаў яе на вакзале, і заўсёды з кветкамі. А іншы раз запрашаў дадому. Хоць гэта было яму і нязручна, бо трэба было адпрошвацца на працы, і калі рабіць такое часта, то супрацоўнікі пачыналі, як кажуць, крыва глядзець. Каб жа хоць жонка не працавала, а то ж і яе дома не было.

Генадзь Адамавіч сустрэў пляменніцу раз, другі, а потым спаслаўся на занятасць. Ды і навошта бачыцца так часта? У дзяўчыны свае планы, у яго — свае. Тым больш, каб прыехаць на той жа Беларускі вакзал, ён траціў на дарогу больш за гадзіну. Няблізка. Ды і не маленькая — калі так ужо ёй трэба пабачыць дзядзьку, магла б, разважаў, і сама дабрацца. І як толькі Валянціна Адамаўна чарговы раз тэлефанавала брату і называла дзень і час прыезду дачкі, той сумна ўздыхаў і нічога канкрэтнага не абяцаў... Ці проста адказваў: яна ведае, дзе я жыву, няхай прыязджае.

Пляменніца не прыязджала. У яе была забраніравана гасцініца. Ды, магчыма, і самой не надта хацелася губляць час на дарогу да дзядзькі, тым больш што ім не было асабліва пра што і пагаманіць. Розны ўзрост, розныя погляды на жыццё.

Таму неяк самі па сабе такія сустрэчы паступова спыніліся. А тут нядаўна Валянціна Адамаўна зноў тэлефануе брату:

— Генка, заўтра мая дачушка едзе ў Маскву, дык я перадала для цябе падарункі — палачку нашай беларускай каўбаскі, скрыль сала і паўлітэрку...

Брат усміхнуўся і, калі паклаў трубку, паглядзеў на жонку:

— Ну і хітрая ж у мяне сястра! Давядзецца ехаць на вакзал — каб не пакрыўдзіць яе. Нічога не паробіш. Можна падумаць, што ў нас няма ні каўбасы, ні сала, ні паўлітэркі...

## ПАГЛЯДЗЕЎ

Пра гэты выпадак мне расказаў гамяльчанін Валянцін Чэпелаў. Паверым яму.

Шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Караганда. У адзін з летніх спякотных дзён усталявалася чарга па піва, якім, прынамсі, яшчэ і не пачыналі гандляваць: толькі-толькі падвезлі бочку. Аднак натоўп гуў як вулей, і калі нехта збіраўся ўтыркнуцца ў жывы ланцужок бліжэй да жаданага напою, а такія нахабнікі знаходзіліся, то іх тут жа ставілі на месца: пастой, дружа, мы такія ж аматары гэтага халодненькага піўка, як і ты. Апрастаць без чаргі куфель-другі не атрымаецца. Май на ўвазе.

Тут, нібы чараўнік, з'явіўся нічым не прыкметны мужчына. Ацаніўшы сітуацыю, ён адразу ж пашыбаваў да піўніка. На яго, вядома ж, зашыкалі. Мужчына ўзняў руку, папрасіў цішыні:

— Спакойна, грамадзяне. Спакойна. Беражыце нервовыя клеткі. Вы мне яшчэ дзякуй скажаце.

Ланцужок насцярожыўся: што там яшчэ за штукар знайшоўся, чаго ён хоча? А мужчына пацікавіўся ў гандляра, колькі грошай каштуе ўсё піва, якое знаходзіцца ў пузатай бочцы. Піўнік, здзіўлена паціскаючы плячыма, назваў кошт — хутчэй за ўсё не надаючы гэтаму пытанню асаблівага значэння:

— Тысяча дзвесце рублёў. Так, хто там у нас першы? Наліваем!..

— Пачакай, не спяшайся. Прадай мне ўсю бочку.

— Усю... бочку? — у піўніка, як падалося, палезлі вочы на лоб.

— Так, так. Ты не памыліўся. Цалкам.

— А што ты з ёю будзеш рабіць? — не мог зразумець піўнік і палічыў яго ўсё ж, мабыць, дзіваком.

— Там пабачыш...

— Дык мяне ж чарга разарве! — ацаніў абстаноўку і сам гандляр. — Ты, няйначай, гэтага хочаш?

— Даю слова: ніхто цябе і пальцам не кране, — мужчына нарэшце прыклаў руку да сэрца. — Сам у гэтым пераканаешся. Ну, дык як? Думай, думай!

А чарга гула, бо гляньце ж вы на гэтага нахабніка — тут смага мучыць, а ён затрымлівае працэс.

— У каршэнь яму! — параіў хтосьці. — Нягоднік! Хам! Не шкадуйце кухталёў!..

Аднак піўнік спакусіўся і ўзяў пук грошай у мужчыны:

— Ну, калі так... Распараджайся. Бочка твая.

— Грамадзяне! — падняў руку мужчына. — Прашу ўвагі! Сёння я частую вас півам бясплатна! Падыходзьце! Хто колькі адужыць — усё ваша! Піце на здароўе!.. Пакуль пуза не развяжацца!..

Не цяжка ўявіць, які адразу ж узняўся вэрхал. Кожны стараўся наліць сабе чым болей пітва, адкуль і посуд толькі браўся. Пачаліся штурханні, таўкатня, а пазней усчаліся і сапраўдныя бойкі. Нехта выклікаў міліцыю, бо справа разгортвалася не на жартачкі. Мужчына, які не пашкадаваў грошай на піва для землякоў, быў адразу ж выяўлены і дастаўлены ў аддзяленне. Пачалі, вядома ж, яго там дакараць-выхоўваць:

— Як жа так, шаноўны? Сваім учынкам вы справакавалі беспарадкі ў нашым культурным горадзе. Ды і даўмецца ж трэба — купіць усю бочку! Ай-я-яй! У вас што, з галавой не ўсё ў парадку?

Мужчына, апраўдваючыся, прызнаўся:

— Ды з галавой, здаецца, усё добра. Але ўжо калі так атрымалася, то даруйце, таварышы міліцыянеры. Я толькі хацеў паглядзець, як мы пры камунізме жыць будзем...

**Васіль ТКАЧОЎ.**



К@нтыненты

# ВАРАЖБА НА БАРАЛІ

## Што адбываецца на нафтавым рынку?

**Гэты тыдзень дакладна ўвойдзе ў найноўшую гісторыю «чорнага золата». Весткі з нафтавага рынку нават здолелі адсунуць з топаў сусветных інфармагенцтваў навіны пра пандэмію каранавіруса. 20 красавіка ф'ючарсны кантракт на амерыканскую лёгкую нафту West Texas Intermediate (WTI) з пастаўкай у маі завяршыў гандлёвую сесію на адзнацы мінус 37,63 долара за бараль, сведчаць даныя амерыканскага біржавога аператара CME Group. Прычым літаральна за некалькі гадзін кошт кантракту абваліўся амаль на $56. Упершыню ў гісторыі на рынку паўстала сітуацыя, калі прадаўцы «чорнага золата» гатовыя даплачваць пакупнікам за яго куплю. «Нічога падобнага і блізка не было ў гісторыі», — узрушана пракаментаваў падзею сайту rbc.ru прафесар фінансаў Х'юстанскага ўніверсітэта Крэйг Піронг, спецыяліст па сыравінных рынках. Раней гэта палічылі б камп'ютарнай памылкай, але цяпер адмоўныя цэны на «чорнае золата»— рэальнасць. Чаму ліхаманіць нафтавы рынак і да чаго гэта прывядзе?**

### У КУШЫНГУ — ПАД ЗАВЯЗКУ

Проектные декларации по объекту, опубликованные в газете «Минский курьер» от 29.08.2017 № 95(3019), от 04.10.2017 № 111(3035), от 17.01.2018 № 6(3075), от 17.08.2018 № 91(3160), от 28.08.2018 № 95(3164), от 17.04.2019 № 44(3258) и в газете «Звязда» от 04.11.2017 № 214(28578), от 14.04.2018 № 72(28688), от 25.04.2018 № 78(28694), считать утратившими силу.


# ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ООО «Инпеллер»** (УНП 191752283) в лице управляющего по делу о банкротстве частного предприятия ООО «Юридический момент», тел. +375 (17) 397-73-07.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **14 мая 2020 г. в 09.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Компрессорно-конденсаторный блок MNAK/71 (1) | 1 140,00 |
| 2 | Компрессорно-конденсаторный блок MNAK/71 (2) | 1 140,00 |
| 3 | Компрессорно-конденсаторный блок MNAK/71 (3) | 1 140,00 |
| 4 | Компрессорно-конденсаторный блок MNAK/71 (4) | 1 140,00 |
| 5 | Компрессорно-конденсаторный блок MNAK/71 (5) | 1 140,00 |
| 6 | Дебиторская задолженность ООО «Магнус Групп» | 118 238,33 |

**Местонахождение предметов торгов – г. Минск, ул. Бабушкина, 15А, тел. для ознакомления и осмотра +37529 666-32-13.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 29.04.2020 г., 09.00 по 13.05.2020 г., 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 04.04.2020 г.

# ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ЗАО «Райагропромэнерго»** (УНП 700003443) в лице ликвидатора Осипенко А.Г.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **26 мая 2020 г. в 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – **Здание многофункциональное с инв. № 710/С-74354, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188, здание котельной с инв. № 710/С-2705, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/1, здание распределительного устройства, с инв. №710/С-74953, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/2.** Начальная цена предмета торгов – 147 868,29 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра: +37529 155-37-27.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 25.04.2020 г., 09.00 по 25.05.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту строительства «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 3 по генплану

**Информация о застройщике:**

Государственное производственное объединение «Минскстрой», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А;

режим работы: пн–чт – 8.30 до 17.45, пт – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00–14.00;

тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков строительства:**
- жилой дом № 60 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июль 2017 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 58 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2018 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 56 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: ноябрь 2017 г. – март 2019 г.;
- жилой дом № 70 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июнь 2018 г. – сентябрь 2019 г.;
- жилой дом № 68 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: сентябрь 2018 г. – октябрь 2019 г.;
- жилой дом № 72 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2019 г. – декабрь 2019 г.

**Информация об объекте строительства**:

ГПО «Минскстрой» осуществляет строительство объекта **«Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 3 по генплану.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Начало строительства – 28 февраля 2020 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 14 апреля 2021 года.

**Результат государственной экспертизы проектной документации:**

Положительное экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 10.02.2020 № 853-15/19.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**

г. Минск, территория в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки.

**Характеристика объекта строительства:**

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90, разработанной ОАО «МАПИД», с техническим подпольем, «теплым» техническим чердаком, встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже здания, плоской рулонной кровлей с организованным внутренним водостоком. Внутренняя отделка квартир: стены и перегородки – акриловая покраска (ванны и санузлы), оклейка обоями (жилые комнаты); покрытие полов – плитка керамическая для пола, ГОСТ 6787-2001 (ванны и санузлы), линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове (жилые комнаты, прихожие, внутриквартирные коридоры, кладовые квартир, кухни); отделка потолков – акриловая покраска. Наружные стены здания запроектированы из сборных железобетонных трехслойных панелей с утепляющим слоем; внутренние стены и перегородки – из сборных железобетонных панелей. Заполнение оконных проемов (оконные блоки, балконные двери) выполняются из деревянного профиля со светопрозрачным заполнением из двухкамерного стеклопакета. Устройство мусоропровода проектом не предусмотрено.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**

Предлагается 132 объекта долевого строительства для заключения договоров.

**Цены на объекты долевого строительства:**

Ориентировочная стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 312,22 белорусского рубля (для нормируемой площади жилого помещения);

1 980,00 белорусского рубля (для площади жилого помещения, превышающей нормируемую).

**Условия оплаты:**

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 20 % от стоимости объекта долевого строительства, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

В соответствии с решениями Мингорисполкома от 07.03.2019 № 667 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2019 году, по строительству жилых домов для многодетных семей», от 14.11.2019 № 3526 «Об изъятии, предоставлении, прекращении существования земельных участков и разрешении строительства» договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться **с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска**.

**Права застройщика на земельный участок:**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-9989 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 10 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 0,0782 га; свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3120 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 24 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 6,3137 га; свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3147 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 26 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 0,1681 га.

**Количество в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома:** общее количество квартир – 132 шт., в т. ч. однокомнатные – 57 шт., двухкомнатные – 57 шт., трехкомнатные – 18 шт.

**Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, а также элементы озеленения и благоустройства.

**Сведения о договоре строительного подряда, заключенного с застройщиком:** договор строительного подряда от 27.02.2020 № 257с-02-20, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства и ходом работ по нему:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Заместитель генерального директора В.А. Косовец

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту строительства «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 4а по генплану

**Информация о застройщике:**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А;

режим работы: пн–чт – 8.30 до 17.45, пт – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00–14.00;

тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков строительства:**
- жилой дом № 60 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июль 2017 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 58 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2018 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 56 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: ноябрь 2017 г. – март 2019 г.;
- жилой дом № 70 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июнь 2018 г. – сентябрь 2019 г.;
- жилой дом № 68 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: сентябрь 2018 г. – октябрь 2019 г.;
- жилой дом № 72 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2019 г. – декабрь 2019 г.

**Информация об объекте строительства**:

ГПО «Минскстрой» осуществляет строительство объекта **«Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 4а по генплану.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Начало строительства – 20 марта 2020 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 19 ноября 2020 года.

**Результат государственной экспертизы проектной документации:**

Положительное экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 28.10.2019 № 556-15/19.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**

г. Минск, территория в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки.

**Характеристика объекта строительства:**

Проектом предусмотрено строительство трехсекционного 9-этажного 104-квартирного жилого дома в конструкциях серии М464-У1.М, с техническим подпольем для прокладки инженерных коммуникаций, теплым чердаком и плоской рулонной кровлей с внутренним водостоком, встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже здания. В квартирах предусмотрена полная планировка, организованы жилые комнаты, кухни, санузлы, ванные, прихожие, летние помещения. В жилых комнатах, прихожих, внутриквартирных коридорах, кладовых, кухнях по стенам и потолкам предусмотрена подготовка поверхностей из ж/б панелей и плит под окраску. Чистовая отделка квартир предусматривает окраску акриловыми красками потолков и стен в ванных и санузлах; оклейку обоями в жилых комнатах, коридорах, прихожих, кухнях. Полы в жилых комнатах, коридорах, прихожих, кладовых, кухнях квартир – линолеум на звукошумоизолирующей основе; в ванных и уборных – керамическая плитка для полов. Наружные стены здания запроектированы из трехслойных сборных железобетонных панелей с энергоэффективным утеплителем; внутренние стены – из сборных железобетонных панелей. Оконные блоки деревянные с двухкамерным стеклопакетом. Устройство мусоропровода проектом не предусмотрено.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**

Предлагается 104 объекта долевого строительства для заключения договоров.

**Цены на объекты долевого строительства:**

Ориентировочная стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 237,73 белорусского рубля (для нормируемой площади жилого помещения);

1 980,00 белорусского рубля (для площади жилого помещения, превышающей нормируемую).

**Условия оплаты:**

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 25 % от стоимости объекта долевого строительства, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

В соответствии с решениями Мингорисполкома от 07.03.2019 № 667 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2019 году, по строительству жилых домов для многодетных семей», от 14.11.2019 № 3526 «Об изъятии, предоставлении, прекращении существования земельных участков и разрешении строительства» договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться **с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска**.

**Права застройщика на земельный участок:**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3120 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него 24 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 6,3137га.

**Количество в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома:** общее количество квартир – 104 шт., в т. ч. однокомнатные – 24 шт., двухкомнатные – 50 шт., трехкомнатные – 30 шт.

**Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, а также элементы озеленения и благоустройства.

**Сведения о договоре строительного подряда, заключенного с застройщиком:** договор строительного подряда от 20.03.2020 № 259с-03-20, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства и ходом работ по нему:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Заместитель генерального директора В.А. Косовец

Жывая прырода

# НЕ МЫШ І НЕ ПТУШКА

## Кажаны — карысныя жывёлы, а не «інкубатары хвароб»

**Нападаюць без прычыны, сілкуюцца выключна крывёй і пераносяць мноства смяротных захворванняў — напэўна, няма жывёл, пра якіх існуе стэрэатыпаў больш, чым пра кажаноў. Негатыўнае стаўленне да звяркоў абвастрылася пасля таго, як навукоўцы выказалі здагадку, што рукакрылыя могуць быць крыніцай COVID-19. Алею ў агонь падліваюць і СМІ, называючы кажаноў «інкубатарамі хвароб» і «самымі небяспечнымі жывёламі». Як вынік, у некаторых краінах звяркоў масава знішчаюць, спадзеючыся такім чынам спыніць распаўсюджванне новага каранавіруса. Якія на самай справе кажаны і чаму нам трэба іх не баяцца, а ратаваць, расказаў старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі малекулярнай заалогіі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Аляксей ШПАК.**



### ПРАЖЭРЛІВЫЯ І КАРЫСНЫЯ

У свеце налічваецца каля 1400 відаў кажаноў, большасць з якіх жыве ў тропіках. У Беларусі сустракаецца толькі 19 відаў гэтых жывёл. Ходзяць міфы, быццам рукакрылыя сілкуюцца выключна крывёй, і часткова гэта звязана з фільмамі жахаў, дзе звяркі нярэдка паўстаюць у вобразе вампіраў. На самай справе харчовая «спецыялізацыя» ў іх вельмі шырокая: хтосьці есць садавіну, а хтосьці — рыбу. Праўда, тры віды кажаноў усё ж п'юць кроў, але пераважна хатніх жывёл. І жывуць яны толькі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы. Усе еўрапейскія рукакрылыя, у тым ліку і беларускія, з'яўляюцца выключна насякомаеднымі.

— Кажаны — вельмі пражэрлівыя звяркі, — падкрэсліў Аляксей Шпак. — За ноч яны з'ядаюць такую масу насякомых, якая складае каля паловы масы іх уласнага цела. Умоўна кажучы, калі мышка важыць 10 грамаў, то яна ловіць каля 5 грамаў насякомых, большасць з якіх шкодзіць сельскай і лясной гаспадарцы. Атрымліваецца, кажаны як драпежнікі апошняга парадку выступаюць у якасці рэгулятараў колькасці насякомых-шкоднікаў. Гэта важная экалагічная роля. Амерыканскія эколагі падлічылі, што рукакрылыя дапамагаюць фермерам эканоміць мільярды долараў, якія пайшлі б на куплю інсектыцыдаў і іншых сродкаў для барацьбы са шкоднікамі.

**• Кажаны могуць паніжаць тэмпературу свайго цела, прыстасоўваючыся да навакольнага асяроддзя.**

### ДОЎГАЖЫХАРЫ

Максімальны ўзрост кажаноў, зафіксаваны навукоўцамі, перавышае 43 гады. Гэта дзіўна, бо ў цеплакроўных жывёл працягласць жыцця звязана з памерамі іх цела, таму слон жыве даўжэй, чым хамяк. Аднак рукакрылыя выбіваюцца з агульнага правіла. Гэтаму да цяперашняга часу няма адназначнага тлумачэння, толькі шэраг гіпотэз. Доўгажыхарства звязваюць і з начным спосабам жыцця звяркоў, і з тым, што яны мала кантактуюць з драпежнікамі. Дарэчы, няма жывёл, якія спецыяльна палююць на кажаноў, яны могуць стаць толькі выпадковай здабычай соў або куніцавых.

— Доўгажыхарства гэтых рукакрылых можа тлумачыцца тым, што прыблізна палову жыцця яны праводзяць у спячцы, падчас якой у іх вельмі моцна зніжаецца тэмпература цела і затрымліваецца хуткасць абменных рэакцый. А яшчэ ў звяркоў цікава працуюць целамеры — канцавыя ўчасткі храмасом. З узростам яны ва ўсіх скарачаюцца, а ў кажаноў ферменты целамеразы гэтаму процідзейнічаюць, — адзначыў спецыяліст.

### УРАЗЛІВЫЯ І ВЕЛЬМІ РЭДКІЯ

Існуе шмат фактараў пагрозы кажанам. Умоўна іх можна падзяліць на натуральныя і антрапагенныя. Да першых адносіцца нізкая пладавітасць жывёл. За год яны нараджаюць аднаго-двух дзіцянят, ад чаго іх колькасць не можа расці хутка. Але больш за ўсё непрыемнасцяў рукакрылым прыносіць чалавек. Так, гэтыя жывёлы вельмі адчувальныя да змен навакольнага асяроддзя, іх можна назваць экалагічнымі індыкатарамі. Высечка лясоў, узворванне зямель і іншая дзейнасць вядуць да гібелі кажаноў, бо яны не паспяваюць прыстасавацца да новых умоў. Вельмі небяспечныя для рукакрылых хімікаты, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы. Пэўную шкоду гэтым жывёлам наносіць ветраэнергетыка: яны, як і птушкі, гінуць ад ветракоў.

**• Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, кажаны выдатна бачаць, але прывыклі спадзявацца не толькі на свае вочы, але і на рэхалакацыю. Жывёлы ўтвараюць гукі на частотах, недаступных чалавечаму вуху, а затым улоўліваюць іх рэха.**

Кажаны не будуюць сабе гнёздаў, таму часта жывуць у шматпавярховых дамах паміж панэлямі, блокамі, у любых шчылінах. Вядома, гэта варта ўлічваць пры правядзенні любых рамонтных работ. Сховішчамі для мацярынскіх калоній могуць быць і дуплы старых дрэў, таму іх па магчымасці неабходна захоўваць.

— У Еўропе існуе стэрэатыпнае, негатыўнае стаўленне да кажаноў. Таму важна праводзіць інфармацыйную работу з насельніцтвам, каб не было такіх выпадкаў, як у Брэсцкай крэпасці, калі вандалы знішчылі некалькі вялікіх калоній гэтых рукакрылых, — падкрэсліў Аляксей Шпак.

### АХОЎНЫЯ

У Еўропе ўсе 53 віды рукакрылых унесены ў Чырвоную кнігу Міжнароднага саюза аховы прыроды. У Беларусі 8 відаў з 19 знаходзяцца ў Чырвонай кнізе. Акрамя гэтага, наша краіна з'яўляецца ўдзельніцай Бонскай канвенцыі па відах дзікіх жывёл, якія мігрыруюць, і Бернскай канвенцыі аб ахове дзікай фаўны і флоры. У дадатку да абедзвюх канвенцый уваходзяць усе віды беларускіх рукакрылых, якіх, у адпаведнасці са ўзятымі на сябе міжнароднымі абавязацельствамі, мы таксама павінны ахоўваць.

### ЗУСІМ НЕ АГРЭСІЎНЫЯ

Рукакрылыя не праяўляюць агрэсіі ні да чалавека, ні да хатніх гадаванцаў.

— Безумоўна, як і любая дзікая жывёла, кажан будзе абараняцца, калі адчуе пагрозу для жыцця. Ён можа ўкусіць, калі вы паспрабуеце ўзяць яго рукой. Але не бывае такога, каб ён нападаў, заблытваўся ў валасах і пачынаў кусаць галаву, — гэта ўсё міфы, — расказаў навуковец.

**• Кажаны — гэта адзіныя млекакормячыя, здольныя да доўгіх палётаў.**



### КРЫНІЦЫ КАРАНАВІРУСА? НЕ ДАКАЗАНА!

Нядаўна ў брытанскім часопісе Nature выйшаў артыкул, дзе ацэньвалі разнастайнасць вірусаў у розных атрадаў млекакормячых. Аказалася, што чым больш відаў у атрадзе, тым больш вірусаў пераносяць іх прадстаўнікі. Самы буйны атрад сярод млекакормячых — гэта грызуны. Рукакрылыя знаходзяцца на другім месцы. І сапраўды, кажаны з'яўляюцца «рэзервуарамі» вялікай колькасці вірусаў. Аднак у асноўным гэтыя вірусы цыркулююць выключна ў папуляцыі саміх кажаноў і не могуць паразіць іншых жывёл.

— Факты перадачы SARS-CoV-2 ад рукакрылых да чалавека не зарэгістраваны. У гэтых жывёл яго наогул няма. Проста навукоўцы, прааналізаваўшы геномы вірусаў, высветлілі, што SARS-CoV-2 на 96 % падобны на адзін з вірусаў кажаноў. Але ў той жа час ён падобны і на вірус, які цыркулюе ў папуляцыі пангалінаў і змей. Таму сёння толькі выказана гіпотэза, што рукакрылыя могуць быць крыніцай вірусных інфекцый, аднак чалавеку яны перадаюцца не наўпрост, а праз прамежкавых гаспадароў. Між тым кажаны наогул мала кантактуюць з іншымі млекакормячымі, — адзначыў Аляксей Шпак.

Цалкам магчыма, што ўспышка новага каранавіруса ўзнікла ў раёне чорнага рынку ў Азіі, куды пастаўлялі вялікую колькасць самых розных дзікіх звяроў.

**• Рукакрылыя жывуць мацярынскімі калоніямі, якія складаюцца толькі з асобін жаночага полу. Мужчынскія ж асобіны жывуць паасобку альбо дробнымі групамі.**

— Вірусаў вялікая колькасць, яны вельмі зменлівыя. Не толькі кажаны — «рэзервуары» вірусаў, імі з'яўляюцца ўсе жывыя істоты без выключэння: і людзі, і каты, і сабакі, і пангаліны, і змеі. Якую праблему ўскрылі COVID-19 і ліхаманка Эбола, у якой таксама абвінавачваюць кажаноў, хоць гэтаму няма пацвярджэнняў? Усе гэтыя выпадкі адбываюцца толькі тады, калі чалавек бесцырымонна ўмешваецца ў дзікую прыроду. І такім чынам ён пачынае кантактаваць не толькі з мілымі звяркамі, але і з тымі вірусамі, якія цыркулююць у іх папуляцыі.

### ШАЛЕНСТВА ПЕРАНОСЯЦЬ, АЛЕ НІКОЛІ НЕ НАПАДАЮЦЬ

Рукакрылыя могуць пераносіць некласічны вірус шаленства. Праўда, у гэтых жывёл захворванне працякае своеасабліва. Па-першае, у іх адсутнічае агрэсіўная стадыя, то-бок звяркі ніколі не нападаюць. Заразіцца можна, толькі ўзяўшы кажана голымі рукамі. За апошнія 40 гадоў выяўлена ўсяго пяць выпадкаў у Еўропе, калі чалавек паміраў ад шаленства па віне рукакрылых. Па-другое, яны могуць выжываць пасля хваробы, што не характэрна для іншых млекакормячых.

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ДА ВАС ЗАЛЯЦЕЎ КАЖАН?

Часцей за ўсё з гэтымі звяркамі людзі сутыкаюцца ў двух выпадках: альбо летам, калі на гарышчы ў цёплым месцы селіцца мацярынская калонія для вываду патомства, альбо зімой, калі звяркі шукаюць прахалодныя і вільготныя месцы для спячкі, выбіраючы для гэтага падвалы, склепы, балконы. Калі кажаны жывуць у вас у доме і не прычыняюць фізічных нязручнасцяў, то лепш за ўсё іх проста не чапаць. У выпадку неабходнасці ўзяць жывёлу ў рукі — напрыклад, звярок заляцеў у дом і зваліўся на падлогу — трэба надзець пальчаткі і не дапускаць кантактаў з хатнімі гадаванцамі.

**• На аснове сліны кажаноў-вампіраў у 2003 годзе быў створаны прэпарат дэсматэплаза, які прадухіляе згортванне крыві і такім чынам з'яўляецца сродкам для прафілактыкі і лячэння вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту (інсультаў).**

Сёлета трэці сезон пачне цэнтр рэабілітацыі кажаноў «Кажанаполіс», куды можна звярнуцца, калі да вас у кватэру заляціць нечаканы госць.

— Кажаны зімуюць у гарадах, і часта іх знаходзяць у пад'ездах, на снезе, на зямлі. Калі звярка ў халодную пару года проста выпусціць на вуліцу, ён загіне. Гэта негуманна, бо мы павінны ахоўваць рукакрылых. У нашым цэнтры яны могуць перазімаваць у спецыяльным халадзільніку, пасля чаго ўвесну мы іх выпускаем. Сёлета ў розны час у нас зімавалі 68 асобін, — расказаў навуковец.

*Звязацца з цэнтрам можна альбо праз сацыяльныя сеткі, альбо па тэлефоне (+ 375-29) 213-92-57. Акрамя таго, тут заўсёды патрэбны валанцёры.*

**Кацярына ЦІТОВА.**
**Фота з архіва Аляксея ШПАКА.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Час пазбаўляцца ад шкодных звычак, асабліва калі вы паліце ці любіце скардзіцца на жыццё. Цяпер спрыяльны час для пабудовы новых глабальных планаў. Для гэтага ў вас ёсць усё: веды, сілы, рашучасць. Перад вамі стаяць цікавыя задачы, неабходна выбраць сродкі і аптымальны тэмп для іх вырашэння. Спадзявацца давядзецца толькі на свае сілы. Хатнія справы таксама запатрабуюць шмат часу, аднак паспрабуйце не ўзвальваць усе праблемы на сябе, лепш пашукайце каго-небудзь менш занятага.

**ЦЯЛЕЦ.** Спатрэбяцца ўнутраны спакой і ўраўнаважанасць. Паветраныя замкі будуць нетрывалыя, іх лепш пакінуць да таго, як яны пачнуць разбурацца пад напорам рэальнасці. Бязлітасна распраўляйцеся з хаосам у асабістым жыцці. Выбірайце надзейнасць, а не прыгожыя кампліменты і пустыя абяцанні. У выхадныя непажадана пачынаць сваркі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вас чакае поспех у прафесійнай сферы. Вы літаральна фантаніруеце ідэямі, хутка і эфектыўна вырашаеце любыя задачы. У чацвер, перш чым прыняць якое-небудзь рашэнне, неабходна ўсё добра ўзважыць. Дзень спрыяльны для людзей, што выбралі літаратурную дзейнасць. У выхадныя пашанцуе ў каханні.

**РАК.** Асаблівае значэнне набудуць такія якасці, як удумлівасць і сабранасць. Калі будуць паездкі — то па справах, калі сустрэчы і знаёмствы — то карысныя і якія абяцаюць нядрэнныя перспектывы. Кожнае ваша дзеянне павінна быць прадуманым і лагічным. У аўторак вас можа наведаць маркота, вельмі пажадана задушыць хандру ў зародку. Не блытайце неразуменне з канструктыўнай крытыкай — гэта зусім розныя рэчы. Пятніца абяцае настроіць на больш высокія матэрыі і схіліць да кахання.

**ЛЕЎ.** Вы будзеце занадта актыўныя і нецярплівыя. Праўда, павысіцца агульны тонус і палепшыцца настрой. Парада, атрыманая ад блізкага сябра, дапаможа знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі. У сераду паспрабуйце не выдаць усе свае сакрэты і наогул менш гаварыць. У чацвер вы бліскуча справіцеся з цяжарам праблем. Субота можа прынесці нечаканую свабоду дзеянняў, але ўсё ж трымайце сябе ў руках.

**ДЗЕВА.** На першы план могуць выйсці праблемы кар'еры і заробку грошай. Неабходна не распыляцца і намеціць канкрэтныя мэты, упэўнена прасоўвацца да іх дасягнення. Не ўзвальвайце на сябе чужыя клопаты і праблемы, інакш не справіцеся з пастаўленымі задачамі. У сераду давядзецца перарабляць ужо гатовае заданне або праект. Можаце разлічваць на дапамогу калег. А вось у пятніцу работа ў адзіноце прынясе лепшыя вынікі.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні лепш лішні раз не сустракацца з начальствам. Пажадана спачатку думаць, а потым дзейнічаць. У аўторак будзе паспяховай інтэлектуальная дзейнасць, асабліва калі побач аднадумцы. У сераду магчымыя пэўныя непаразуменні з партнёрамі — паспрабуйце пачуць не толькі сябе. У нядзелю спатрэбіцца асцярожнасць, каб не здзейсніць непапраўных памылак у асабістым жыцці. У выхадныя больш увагі ўдзяляйце дзецям.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні з'явіцца рэальная магчымасць для карэкцыі свайго лёсу, унясення ў яго чагосьці новага, незвычайнага. Даверцеся голасу інтуіцыі, і яна вас не падвядзе. Дазвольце сабе кахаць і быць каханымі. У вас будзе высокі творчы патэнцыял, узрасце аўтарытэт у прафесійнай сферы. У нядзелю нічога новага лепш не прадпрымаць — займіцеся тым, што вам ужо даўно падабаецца.

**СТРАЛЕЦ.** З'явіцца выдатны шанц разабрацца з важнымі супярэчнасцямі, якія хвалявалі, але для гэтага спатрэбіцца разумны кампраміс з вашага боку. У сераду варта праявіць сябе, а не сціпла маўчаць. Магчымыя цікавыя знаёмствы праз інтэрнэт. Чацвер можа засмуціць дробнымі непрыемнасцямі, але, на жаль, гэта плата за адсутнасць буйных праблем. У выхадныя паспрабуйце навесці парадак і раскласці ўсё па палічках — як у доме, так і ў сваіх думках і пачуццях.

**КАЗЯРОГ.** Рабочыя справы буксаваць не будуць. Вашы сябры і партнёры падзеляць з вамі радасці і памылкі. У сераду можаце разлічваць на душэўную размову і слушную параду. Добры час, каб пачаць займацца чым-небудзь новым: танцамі, маляваннем або ёгай. Будзе не так проста знайсці агульную мову з сям'ёй — у кожнага могуць аказацца свае інтарэсы, якія не супадаюць з вашымі.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні перад уважлівымі людзьмі адкрыюцца новыя перспектывы. Рэалізацыя даўніх ідэй здольная прынесці маральнае і матэрыяльнае задавальненне. У сераду акажуцца паспяховымі перамовы, пры гэтым зусім не абавязковыя асабістыя сустрэчы — можна зладзіць відэаканферэнцыю. У пятніцу не варта раскідвацца словамі і тым больш даваць невыканальныя абяцанні — лепш патраціць гэты дзень на сябе, заняўшыся ўвасабленнем у жыццё даўняй мары. У выхадныя не спрачайцеся з блізкімі людзьмі, сямейная сварка — не самае лепшае ўпрыгажэнне выхадных.

**РЫБЫ.** Тыдзень абяцае поспех у пачынаннях, звязаных з кар'ерным ростам. Каб не ўпусціць прыемны і доўгачаканы момант, вам нельга губляць час дарма — выявіце максімум працавітасці і працаздольнасці. Будзеце карыстацца агульнай увагай, і вас гэта зусім не збянтэжыць. Магчыма, давядзецца змяніць кола знаёмых. У суботу і нядзелю пажаданы пасіўны адпачынак у спакойнай абстаноўцы.

## Даты Падзеі Людзі

### 25 КРАСАВІКА

У краіне

**1910** год — нарадзіўся Васіль Якаўлевіч Савельеў, беларускі вучоны ў галіне электронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар (1968), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі (1975).

**1940** год — нарадзіўся Аляксандр Альфрэдавіч Машэўскі, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук (1995), прафесар (1999).

**1945** год — нарадзіўся Аркадзь Аркадзевіч Анішчык, беларускі мастак у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**1950** год — нарадзіўся Аляксандр Барысавіч Уладамірскі, беларускі акцёр. Служыў у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы, Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі.



**1955** год — нарадзіўся Віктар Васілевіч Мікіта, беларускі мастак. У 1979 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, у 1981—1986 гадах выкладаў там жа. Працуе пераважна ў станковай і кніжнай графіцы, а таксама ў жывапісе.

**1990** год — Вярхоўны Савет СССР упершыню абвясціў, што тэрыторыі Украіны, Беларусі і РСФСР трапілі пад радыеактыўнае забруджанне.

У свеце

**1910** год — нарадзіўся Мікіта Фёдаравіч Карацупа, расійскі пагранічнік, заснавальнік савецкай школы пагранічнікаў і следапытаў, Герой Савецкага Саюза (1965). Удзельнічаў у 120 сутычках з ворагамі, жывымі затрымаў 338 і знішчыў 129 парушальнікаў граніцы.

**1920** год — наступленнем польскіх войскаў на Кіеў пачалася савецка-польская вайна (працягвалася да 12 кастрычніка).

**1940** год — нарадзіўся Міхаіл Івانавіч Конанаў, расійскі артыст тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Зняўся больш чым у 60 стужках.



У гэты ж дзень нарадзіўся Аль Пачына, амерыканскі акцёр, рэжысёр.

**1945** год — у горадзе Сан-Францыска (ЗША) пачалася канферэнцыя 50 дзяржаў — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). 26 чэрвеня быў падпісаны Статут ААН.

**1945** год — на рацэ Эльба ў раёне горада Таргау адбылася гістарычная сустрэча войскаў 1-га Украінскага фронту і 1-й Амерыканскай арміі — саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі.

Так гаварыў...

**ВАЛЬТЭР:**
*«Бясконца нікчэмныя людзі маюць бясконца вялікую гордасць».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.46 | 20.30 | 14.44 |
| Віцебск | 5.31 | 20.24 | 14.53 |
| Магілёў | 5.36 | 20.21 | 14.45 |
| Гомель | 5.37 | 20.13 | 14.36 |
| Гродна | 6.01 | 20.45 | 14.44 |
| Брэст | 6.06 | 20.41 | 14.35 |

### Месяц

*Маладзік 23 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр.* Афанасіі, Васіля, Івана, Давыда.
*К.* Марка, Ярослава.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Мама падарыла сыну два гальштукі. Праз некалькі дзён ён надзеў адзін з іх і прыйшоў да яе ў госці. Мама адкрыла дзверы, глядзіць і пытаецца: «А што, другі гальштук табе не спадабаўся?»

**— Прывітанне, Марынка, ты ў новай сукенцы! А што такая сумная сядзіш?**
**— Прысаджвайся, раскажу.**
**— Давай, што здарылася?**
**— Лаўка пафарбаваная!**

Кожную гадзіну я раблю перапынак у працы за камп'ютарам і дастаю смартфон...

**— Сямён, ты так жартуеш, нібы ў цябе ўсе зубы малочныя!..**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1292.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 красавіка 2020 года.